Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЖНІЎНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №158 (28522)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Абмяркуем па-сямейнаму

СТАР. 4



Сакрэты легальных махляроў

СТАР. 16



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван КАНАРАЗАЎ, галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя:**

*«Сёння ў рэспубліцы дзейнічае падпраграма «Папярэджанне і пераадоленне п'янства і алкагалізму» дзяржпраграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» да 2020 года. Дзякуючы закладзеным у ёй мерам дасягнуты значныя вынікі. У прыватнасці, гаворка ідзе пра зніжэнне захваральнасці на алкагалізм, змяншэнне колькасці асоб, якія ўпершыню выяўляюцца наркалагічнай службай, ставяцца на дыспансерны і прафілактычны ўлік. Знізілася смяротнасць ад атручвання алкаголем, скарацілася колькасць траўмаваных у ДТЗ з удзелам нецвярозых вадзіцеляў і пешаходаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9379 | ▼ |
| Еўра | 2,2752 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0759 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Пясняр назаўжды



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчанка Вікторыя ДУБРОЎСКАЯ прыйшла да помніка Уладзіміру Мулявіну, які ўчора адкрылі ў Мінску каля Дзяржфілармоніі.

■ Жыллё мае

## ДА КАНЦА ГОДА «КАМУНАЛКА» ЗМЕНІЦЦА ДВОЙЧЫ,

### а ў 2025 годзе насельніцтва будзе кампенсаваць паслугі ЖКГ на 100%

**Капітальны рамонт, раздзельны збор смецця, павышэнне якасці пітной і сцёкавай вады, тарыфікацыя жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) і іншыя пытанні па ўдасканаленні развіцця і дзейнасці ЖКГ краіны з мэтай стварэння спрыяльных умоў жыццядзейнасці насельніцтва разгледзелі ўчора на пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі і Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага кіравання.**

У краіне створана неабходная заканадаўчая база для рашэння пытанняў ЖКГ, зацверджана сістэма дзяржаўных сацыяльных стандартаў, праводзіцца праграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе на 2016—2020 гады». Разам з тым у большасці галін ЖКГ існуе шмат праблем, што вырашаюцца марудна і назапашваюцца. З гэтай нагоды кіраўнік дзяржавы на сваім узроўні вырашыў разгледзець пытанні ЖКГ на семінары ў верасні бягучага года, дзе абяцаў прыняць адпаведныя рашэнні і ацаніць кадры, адзначыў **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ,** характарызуючы стан камунальнай гаспадаркі краіны.

— Згодна з дакладам ПРААН, Беларусь уваходзіць у лік 24 краін, насельніцтва якіх мае 100-працэнтна ўстойлівы доступ да палепшаных крыніц вады. Разам з тым у апошнія гады расце колькасць уцечак і няўлічаных расходаў у сістэмах водазабеспячэння, пагоршылася якасць ачысткі сцёкаў. Каля 9 млн кубаметраў недастаткова ачышчаных водаў скідваецца ў вадаёмы. Тэхнічны рашэнні ўдасканальваюцца слаба, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Ён агучыў і шэраг іншых недасканаласцяў сістэмы ЖКГ. Перш за ўсё, вельмі нізкі ўзровень аплаты насельніцтвам паслуг ацяплення, што адбываецца праз адсутнасць сістэм уліку адпушчанай цеплавой энергіі. У жыллёвым фондзе маюцца цеплатрасы пры выпрацоўцы і транспарціроўцы цепланосьбітаў.

Збор і ўтылізацыя цвёрдых бытавых адходаў патрабуе ўдасканалення і, па сведчанні парламенцкага маніторынгу і службаў аховы прыроды, санітарна-эпідэміялагічны стан аб'ектаў і тэрыторый не паляпшаецца.

СТАР. 2

■ Класныя навіны

## Адукацыя для жыцця

### Быць у працэсе пошуку — нармальны стан любога дзіцяці

**Рэспубліканскі тыдзень устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі пройдзе ў Беларусі з 2 па 9 верасня. Асноўная яго мэта — шырокае прыцягненне дзяцей і падлеткаў краіны да заняткаў у гуртках, студыях, клубах і іншых аб'яднаннях па інтарэсах.**

Сёння ў краіне дзейнічаюць 297 устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Гэта менш, чым было, скажам, яшчэ некалькі гадоў таму, але аптымізацыя сеткі — натуральны працэс. Па-першае, былі перапрафіляваны аб'яднанні па інтарэсах, не запатрабаваныя навучэнцамі, па-другое, рэарганізаваны ўстановы дадатковай адукацыі са слабай матэрыяльна-тэхнічнай базай. Дзесьці трэба было аб'яднаць рэсурсы. Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя да павелічэння колькасці шматпрофільных устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Але **колькасць ахопу навучэнцаў не зменшылася: аб'яднанні па інтарэсах наведвае кожны трэці з іх.**

СТАР. 4



Фота Надзеі БУЖАН.

## Пад наглядам Прэзідэнта

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка праінспектуе ход уборачнай кампаніі ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У другой палове дня 16 жніўня Прэзідэнт працягнуў серыю рабочых паездак па краіне. Калі некалькі дзён таму кіраўнік дзяржавы падрабязна азнаёміўся і пракантраляваў ход уборачнай кампаніі на паўднёвым захадзе Беларусі, то зараз у цэнтры ўвагі Аляксандра Лукашэнкі ўсходнія рэгіёны.

«Прэзідэнт Беларусі на верталёце абляцеў усходнюю частку сталічнага рэгіёна і большасць раёнаў Магілёўскай вобласці, назіраючы з вышыні за ўборкай ураджаю», — праінфармавалі ў прэс-службе. Ужо сёння Аляксандр Лукашэнка асабіста наведае і пракантралюе сітуацыю на палях і ў гаспадарках гэтых рэгіёнаў. Запланаваны мерапрыемствы і на палях Віцебскай вобласці.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*




## Міліцыя на службе і на ніве

### Гродзенскія праваахоўнікі не толькі сочаць за парадкам, але і дапамагаюць на ўборцы

**Узровень злачыннасці ў Гродзенскай вобласці — адзін з самых нізкіх у краіне. Агульную тэндэнцыю таксама можна назваць станоўчай, бо за 10 гадоў колькасць правапарушэнняў у рэгіёне скарацілася амаль напалову. Аб гэтым паведаміў падчас прэс-канферэнцыі начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў Вадзім СІНЯЎСКІ.**

Так, за 6 месяцаў гэтага года зафіксавана 40,4 правапарушэння на 10 тыс. насельніцтва. Менш толькі ў Брэсцкай вобласці — 38,5. Значна знізілася колькасць забойстваў, грабяжоў, вымагальніцтваў, выкраданняў, махлярства. Павысіўся і працэнт раскрывальнасці. За першае паўгоддзе ён складае 68,1% ад усіх правапарушэнняў. У гэтай справе міліцыі садзейнічаюць неабыякавыя жыхары вобласці. За паўгода яны дапамаглі знайсці 7 злачынцаў, фота і відэа якіх былі размешчаны на афіцыйным сайце УУС і ў сацыяльных сетках.

Свой плён дае і барацьба з незаконным абаротам наркотыкаў. Злачыннасць у гэтай сферы зніжаецца. Менш стала фактаў збыту. Гэта звязана з затрыманнем вялікіх партый наркотыкаў, што папярэджвае іх распаўсюджванне, асабліва ў маладзёжным асяроддзі. Так, з пачатку года затрымана 74 кг гашышу, спынена работа 19 інтэрнэт-крамаў. Зараз расследуюцца справы ў дачыненні грамадзян Расіі, Украіны, Беларусі, звязаныя са збытам наркотыкаў. Работу ў гэтым кірунку гродзенскія праваахоўнікі лічаць прыярытэтнай. Ва ўсіх райаддзелах вобласці ўведзены стаўкі супрацоўнікаў па наркакантролі.

Асаблівую ўвагу варта ўдзяляць і праблеме п'янства. Ад атручвання алкаголем загінула ў вобласці 89 чалавек. За паўгода ў рэгіёне рэалізавана з разліку на кожнага жыхара 30 літраў алкаголю. Гродзенскія праваахоўнікі лічаць, што продаж алкагольнай прадукцыі трэба больш рэгламентаваць.

Вадзім Сіняўскі выказаў занепакоенасць ростам злачынстваў сярод падлеткаў. За паўгода імі здзейснена 121 правапарушэнне. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года рост склаў 36%. Расце колькасць крадзяжоў, выкраданняў аўтамабіляў, хуліганства. Да гэтага падключающа і малалетнія, прытым у стане алкагольнага ап'янення. Выяўлена 80 фактаў злачынстваў навучэнцаў устаноў адукацыі.

Вадзім Сіняўскі агучыў і факты правапарушэнняў, якія выяўлены падчас жніва. Так, у адной з гаспадарак Свіслацкага раёна знішчылі 45 т збожжа мінулага ўраджаю, каб вызваліць месца для новага. Па гэтым факце ўзбуджана крымінальная справа. Таксама падчас уборачнай кампаніі быў затрыманы кіроўца аднаго з сельгаспрадпрыемстваў Шчучынскага раёна. У кабіне яго машыны быў устаноўлены прыбор, які карэкціраваў паказанні спідометра. Толькі за адзін дзень вадзіцель краў каля 180 л дызельнага паліва. Назіраюцца і факты недастатковай захаванасці дарагой тэхнікі, ёсць выпадкі, калі адпраўляюць на металалом вузлы і агрэгаты, якія яшчэ можна выкарыстоўваць. Дарэчы, міліцыя не толькі сочыць за парадкам, але і дапамагае на ўборцы. Пяць супрацоўнікаў унутраных спраў спецыяльна ўзялі водпуск падчас жніва, каб працаваць на полі.

Цяпер у абласным упраўленні вядзецца работа па замяшчэнні вакантных пасад. У Гродзенскую вобласць накіравана 59 выпускнікоў Акадэміі МУС і 15 выпускнікоў Магілёўскага інстытута МУС. Поўнасцю ўкамплектавана ўпраўленне крымінальнай міліцыі. Вядзецца набор на пасады ўчастковых інспектараў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# РАЗЛІКІ НА ЗАЎТРА

### Наступны год павінен «падрасціць» ВУП на 3,4%

**Праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, бюджэту і асноўных кірункі грашова-крэдытнай палітыкі дзяржавы на наступны год разгледзелі на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ паведаміў: актыўная работа над праектамі названых дакументаў вядзецца ўжо чатыры месяцы.**

Паводле яго слоў, за аснову ўзятыя два сцэнарыі развіцця эканомікі ў залежнасці ад розных знешніх і ўнутраных умоў. Першы — гэта мэтавы сцэнарый, на аснове якога распрацаваны праект прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Для разліку бюджэту за аснову ўзяты кансерватыўны сцэнарый развіцця. «У прагнозных дакументах захоўваюцца прынцыпы ацэнкі работы кіраўнікоў усіх узроўняў на аснове ключавых паказчыкаў эфектыўнасці. Для ўрада і Нацбанка такімі паказчыкамі будуць з'яўляцца найважнейшыя параметры прагнозу. Усяго іх 7», — адзначыў кіраўнік урада.

Андрэй Кабякоў звярнуў увагу, што пры мэтавым сцэнарыі прагназуецца рост ВУП на 3,4%, прадукцыйнасці працы — на 2,8%. Інвестыцыі ў асноўны капітал перавысяць чаканыя інвестыцыі ў гэтым годзе на 6,8 працэнта, экспарт прырасце на 6 працэнтаў пры практычным збалансаванасці знешняга гандлю. Акрамя гэтага, чакаецца прыцягненне 1,45 млрд долараў ЗША прамых замежных інвестыцый. Інфляцыя за год (ад снежня да снежня) не павінна перавысіць сямі працэнтаў, а рэальныя наяўныя даходы насельніцтва ў 2018 годзе вырастуць на 3,2 працэнта.

«Гэтыя параметры дазваляюць забяспечыць выхад на траекторыю росту эканомікі, прадугледжаную пяцігадовай праграмай. Прапануецца захаваць вертыкальна інтэграваную сістэму ключавых паказчыкаў і для кіраўнікоў усіх узроўняў. Асноўны ўпор у гэтай сістэме — на якасныя (фінансавыя) паказчыкі, экспарт і стварэнне новых працоўных месцаў», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Ён звярнуў увагу на неабходнасць таго, каб мэтавыя параметры эканамічнага развіцця на 2018 год адпавядалі параметрам развіцця, прадугледжаным праграмай пяцігодкі. А гэта ў першую чаргу забеспячэнне збалансаванасці плацежнага балансу і бюджэту і ўстойлівасць фінансавай сістэмы, якая стымулюе эканамічны рост. Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што на гэтыя мэты павінны быць арыентаваны ўсе інструменты эканамічнай палітыкі. Прэм'ер-міністр падкрэсліў таксама неабходнасць істотнага павышэння канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў і паслуг на знешніх рынках і зніжэння залежнасці эканомікі ад ваганняў на сыравінных рынках. «Рост экспарту на 6% — гэта вельмі няпростая задача. Рост павінен быць забяспечаны ў асноўным за кошт нарошчвання фізічных аб'ёмаў тэхнікі, прадукцыі АПК, паслуг», — адзначыў ён.

Яшчэ адзін аспект, на які акцэнтаваў увагу Андрэй Кабякоў, — стварэнне новых працоўных месцаў і новых прадпрыемстваў пры актыўным уцягванні ў гэты працэс прыватнага капіталу. Таксама ў цэнтры ўвагі развіццё рэгіёнаў, якія валодаюць высокім вытворчым патэнцыялам і адпаведнай інфраструктурай.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

# ДА КАНЦА ГОДА «КАМУНАЛКА» ЗМЕНІЦЦА ДВОЙЧЫ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Капітальны рамонт жылля з аднаго боку недастатковы, а з іншага — недасканалы механізм фінансавання капрамонту. У гэтай важнай справе не ўкараняецца прыватна-дзяржаўнае партнёрства. Хоць ёсць добрыя яго прыклады, скажам, у Расіі. Утрыманне жыллёвага фонду і прыдамавых тэрыторый таксама патрабуе ўдасканалення. А характар наступстваў адміністрацыйнага зніжэння тарыфаў на ЖКП можа быць небяспечны. Замест кампетэнтных эканамічных і арганізацыйна-тэхнічных рашэнняў Мінжылкамгас і камунальныя службы на месцах захапляюцца дырэктыўнай дзейнасцю. Патрэбна адзіная дзяржаўная палітыка ў галіне: эканамічная, металагічная, кадравая, інвестыцыйная, тарыфная, — параіў Міхаіл Мясніковіч.

Тарыфная палітыка, дарэчы, цяпер базіруецца на паэтапным павышэнні тарыфаў для насельніцтва. Указам Прэзідэнта №550 зацверджаны штогадовы рост тарыфаў з 1 студзеня ў эквіваленце пяці долараў і штоквартальная індэксацыя тарыфаў на ЖКП у залежнасці ад росту даходаў насельніцтва. Тарыфная палітыка пралічана ўжо да 2020 года.

Да канца 2017-га запланавана дзве індэксацыі. Кошт комплексу базавых паслуг ЖКГ падрасце 1 верасня на 8% і 1 снежня — на 10%.

— Гэта звязана з ростам намінальнага налічанага заробку людзей, — растлумачыў **Іван ВЕЖНАВЕЦ, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі (МАРГ).** — З улікам такой індэксацыі і запланаванага з 1 студзеня 2018-га павышэння платы за ЖКП у межах пяці долараў мы выйдзем па ўсіх паслугах ЖКП, за выключэннем цеплазабеспячэння, на 100-працэнтны ўзровень пакрыцця затрат.

На некаторыя паслугі рост будзе істотны, дадаў ён. Так, тарыф па каналізацыі вырасце на 48,5%, кошт халоднага водазабеспячэння павялічыцца на 27,7%, радок па абароце з цвёрдымі камунальнымі адходамі «пацяжэе» на 19%. Пры гэтым агульна «жыроўка» павялічыцца толькі на пяць долараў. Такім чынам на канец 2017-га аплата ЖКП у двухпакаёўцы памерам 48 м² з трыма жыхарамі ў ацяпляльны перыяд абыдзецца ў 93 рублі, а ўзровень пакрыцця насельніцтвам комплексу камунальных паслуг узрасце да 74,8%. Да канца 2018-га гэты паказчык дасягне 85%, да 2020 года — будзе 93,3%, а вось планаваных 100% дасягнуць можна будзе толькі ў 2025-м.

**Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні** запэўніў, што работа па вырашэнні пытанняў ЖКГ працягнецца праз стасункі са спецыялістамі адпаведных структур, каб распрацаваць канкрэтныя прапановы да верасеньскага семінара з удзелам кіраўніка дзяржавы:

— Калі Прэзідэнт гаворыць пра рэфармаванне камунальных структур, ён, пэўна, мяркуе пра сур'ёзную прадуманую канцэпцыю, якую можна прапанаваць для рэфармавання. Прапановы прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў па ўдасканаленні сістэмы ЖКГ узнялі масу праблем, якія патрабуюць вырашэння. Тарыфная палітыка, навакольнае асяроддзе, функцыянаванне сістэм водазабеспячэння і іншыя — гэта пытанні, якія характарызуюць наша жыццё. Яны патрабуюць сур'ёзнай каардынаванасці і перш за ўсё — на ўзроўні ўрада. Мы пастараліся сёння знайсці кірункі, якія трэба рэалізаваць.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Пентагон выконвае загад Трампа распрацаваць варыянты адказу на пагрозы КНДР



Прэзідэнт ЗША Дональда Трамп даў дакладнае распараджэнне «распрацаваць надзейныя і эфектыўныя ваенныя варыянты» ў адказ на пагрозы з боку КНДР, і Пентагон «займаецца менавіта гэтым». Адпаведную заяву зрабіў у гутарцы з журналістамі, якія яго суправаджаюць, старшыня Камітэта начальнікаў штабоў Узброеных сіл ЗША генерал Джозэф Данфард, які знаходзіцца з афіцыйным візітам у КНР.

Як паведаміла агенцтва Associated Press, такім чынам ён адказаў на просьбу пракаментаваць словы галоўнага палітычнага стратэга Белага дома Стывена Бэнана, які сказаў у апублікаваным у сераду інтэрв'ю часопісу American Prospect, што «ніякага ваеннага рашэння [паўночнакарэйскай ракетнай праблемы] няма». Тым не менш Данфард падкрэсліў, што Трамп прама загадаў «нам распрацоўваць надзейныя і эфектыўныя ваенныя варыянты, і мы займаемся менавіта гэтым».

Па яго словах, ваенны адказ на ракетную пагрозу КНДР быў бы «жахлівы», аднак дазволіць Пхеньяну распрацоўваць сродкі нанясення ядзернага ўдару па Злучаных Штатах — «недапушчальна».

### Прышціна адхіліла прапанову кіраўніка МЗС Сербіі падзяліць Косава

Прадстаўнік непрызнанай Саўбезам ААН рэспублікі Влора Чытаку заявіла, што абвешчаная ў аднабаковым парадку незалежнасць Косава — «гэта не часовы праект».

Прышціна лічыць прапанову кіраўніка МЗС Сербіі Івіцы Дачыча падзяліць Косава на сербскі і албанскі раёны небяспечнай для рэгіёна. Пра гэта заявіла ўчора на пасяджэнні Савета Бяспекі ААН прадстаўнік непрызнанай рэспублікі Влора Чытаку.

«Вяртанне канцэпцыі прынцыпу рашэнняў па этнічных меркаваннях — гэта небяспечна для ўсяго рэгіёна. Калі мы адхілім культурную і этнічную разнастайнасць унутры нашых дзяржаў, унутры нашых меж, тады якім чынам мы зможам суіснаваць [з Сербіяй] у Еўрапейскім саюзе, не кажучы ўжо пра больш чым калі-небудзь узаемазвязаны свет. Нармалізацыю і прымірэнне не дабіцца драбненнем і падпарадкаваннем», — адзначыла прадстаўнік непрызнанай рэспублікі.

### Мельбурн прызнаны самым камфортным горадам свету

Горад Мельбурн у Аўстраліі названы самым камфортным горадам для жыцця, па версіі аналітыкаў выдання The Economist, паведамляюць інфармагенцтвы.

Складальнікі спісу ўлічвалі стабільнасць, інфраструктуру, стан навакольнага асяроддзя, аховы здароўя і адукацыі, культуры. Мельбурн набраў 97,5 бала са 100 магчымых. На другім месцы ў рэйтынгу размясцілася Вена (Аўстрыя), далей ідуць тры канадскія гарады — Ванкувер, Таронта, Калгары. У топ-10 па камфорце для жыцця таксама ўвайшлі Адэлаіда, Перт (Аўстралія), Окленд (Новая Зеландыя), Хельсінкі (Фінляндыя), Гамбург (Германія). Усяго ацэньвалася 140 гарадоў.

Як правіла, у лідары рэйтынга трапляюць не самыя буйныя гарады эканамічна развітых краін свету. Гэта тлумачыцца тым, што ў мегаполісах досыць адчувальная нагрузка на інфраструктуру, больш складана забяспечваць бяспеку.

■ На сувязі

# ЦЭНТРАЛЬНЫ РАЁН ХОЧА ДАДАЦЬ ВАС У СЯБРЫ

## Як цэнтр сталіцы апынуўся ва ўсіх сацыяльных сетках

**Яшчэ з дзясятак гадоў таму маладое пакаленне папракалі тым, што яно шмат часу праводзіць у інтэрнэце. Маўляў, там адны «гульні». Зараз жа немагчыма ўявіць сабе хоць бы адну сферу жыцця, так ці інакш не прадстаўленую ў сусветным сеціве. Вось і адміністрацыя Цэнтральнага раёна Мінска вырашыла выйсці на новы ўзровень узаемадзеяння з мясцовымі жыхарамі. Так што сочым, ці, па-моднаму кажучы, «фолавім»...**



Кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна Ігар БУЗОЎСКІ.

Паразмаўляць з прадстаўнікамі адміністрацыі цяпер можна не толькі падчас асабістага прыёму, па тэлефоне або праз зварот на сайце, але таксама і праз самыя папулярныя ў Беларусі сацыяльныя сеткі: «УКантакце», «Фэйсбук», «Аднакласнікі», «Твітар» і «Інстаграм». І калі ў трох першых публікуецца адзіны кантэнт, то кароткія паведамленні і фатаграфіі трапляюцца і эксклюзіўныя. Напрыклад, у Інстаграме можна адшукаць здымак Нямігі пад аўтарствам кіраўніка раёна з лаканічны подпісам «Неба над Цэнтральным». Дарэчы, **Ігар БУЗОЎСКІ** прызнаўся, што нярэдка асабіста робіць публікацыі ў акаўнтах раёна. Бліжэй за ўсё па духу яму «Твітар» з яго лаканічнасцю і аператыўнасцю, праз яго кіраўнік адміністрацыі нават праводзіць тэкставыя анлайн-трансляцыі прыёму грамадзян.

Аб чым жа можна даведацца, вывучыўшы групу раёна ў сацсетках? Напрыклад, як прайшло адкрыццё пасля абнаўлення аднаго з самых знакамітых універсамаў Мінска «Цэнтральны», хто прэтэндуе на званне «Найлепшы дворнік» ці што трэба зрабіць, каб паўдзельнічаць у дабрачыннай акцыі «У школу з Добрым Сэрцам». Абмяркоўваюцца тут і праблемныя пытанні. З апошняга: адна з жыхарак раёна паскардзілася, што ніяк не могуць уладкаваць унука ў дзіцячы садок, «абышлі ўсе найбліжэйшыя». На што атрымала адказ, што «гэта заканадаўча пэўная працэдура. Не трэба хадзіць па дзіцячых садках у пошуках месца для дзіцяці. Трэба зарэгістравацца праз службу "Адно акно" і прыйсці ва ўпраўленне адукацыі за накіраваннем». У выніку клапатлівая бабуля паабяцала трымаць адміністрацыю ў курсе падзей. Нягледзячы на тое, што ў адміністрацыі няма SMM-спецыялістаў, якія б займаліся толькі сацыяльнымі сеткамі, кантэнт абнаўляецца рэгулярна, нярэдка і па некалькі разоў на дзень.

Аднак работа з сацыяльнымі сеткамі — гэта толькі частка вялікага праекта, які рэалізуецца як пілотны сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, гарадскімі і рэспубліканскімі СМІ. Дарэчы, сыходзіць выключна ў віртуальную прастору ў раёне негатовыя, бо прыхільнікаў друкаванага слова зусім не мала.

У рамках рэалізацыі праекта абнавілі і сайт адміністрацыі: ён стаў больш сучасным і зручным. «Фішкай», якая можа прымусіць «завіснуць» на сайце, стала бесперапынная анлайн-трансляцыя, якая вядзецца камерай, што выходзіць на праспект Пераможцаў.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

■ Надвор'е

# І зноў яна вяртаецца, спёка да +34°...

## А з ёй спадарожнікі — кароткачасовыя дажджы, навальніцы

**Спякота да 34 градусаў чакаецца ў Беларусі ў выхадныя, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць маларухомы франтальны раздзел і цёплыя паветраныя масы, якія распаўсюджваюцца з поўдня Еўропы. Ноччу на большай частцы Мінскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцей, месцамі на астатняй тэрыторыі краіны, а днём пераважна па паўночна-заходняй частцы пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Пры навальніцах месцамі магчымы парывы ветру да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—19 градусаў. Удзень — 24—29, па паўднёвым усходзе — 30—32.

У суботу Беларусь застанецца пад уплывам вельмі цёплай паветранай масы трапічнага паходжання, днём у крайніх заходніх раёнах адаб'ецца ўплыў малаактыўнага атмасфернага фронту. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ноччу ў асобных раёнах Віцебскай вобласці, а днём па крайнім захадзе краіны магчымы кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Ноччу будзе 15—20, днём — 28—34 градусы.

У нядзелю спякота пачне сыходзіць на ўсход. Усходняя частка краіны застанецца пад уплывам вобласці высокага атмасфернага ціску і вельмі цёплай паветранай масы трапічнага паходжання, а заходняя апынецца ў зоне франтальнай сістэмы, якая будзе зміяшчацца з тэрыторыі Польшчы. На захадзе Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымыя навальніцы, раніцай і днём моцныя дажджы, можа прайсці град. Тэмпература паветра ўначы складзе 15—20 градусаў. Днём будзе 23—29, па ўсходзе — 30—34 градусы, па захадзе — 17—22 вышэй за нуль.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## АРТЭРЫЯ ЖЫЦЦЯ І РУХАВІК ЭКАНОМІКІ

**Днямі ў Клецкім раёне ўведзены ў эксплуатацыю чарговы ўчастак аб'язной аўтадарогі ў паўтара кіламетра. Пракладзены гэты адрэзак за кароткі час — шэсць месяцаў. Усяго ж асфальтаваная траса працягнулася на 8 кіламетраў. Узводзілася яна на працягу чатырох гадоў. Адметна, што будавалася за кошт транспартнага збору і сродкаў раёна.**

— Перш чым прыступіць да рэалізацыі праекта, мы прааналізавалі ўсе «за» і «супраць». І прыйшлі да высновы, што траса жыццёва неабходная. Рэч у тым, што ўвесь транзітны велікагрузны транспарт, які накіроўваецца ў бок Брэсцкай вобласці, ідзе цераз наш горад. Машыны ствараюць небяспеку для жыхароў, асабліва малых і школьнікаў, паколькі на шляху руху грузавіко размяшчаюцца дзіцячыя ўстановы. Да таго ж тэхніка наносіць шкоду асфальтаваму пакрыццю вуліц. Таму было прынятае рашэнне накіраваць транзітны транспартны паток у абыход райцэнтра, — адзначыў **старшыня Клецкага райвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**

Будоўлю можна назваць сапраўды народнай. Акрамя мясцовага дарожна-будаўнічага ўпраўлення — 212, актыўны ўдзел у ёй прымалі сельгасарганізацыі раёна. Выдзялялі тэхніку, рабочых, матэрыяльныя рэсурсы, дастаўлялі пясок і гравій. Цяжка паверыць, што на гэтым месцы было балота, а цяпер адна за адной праносяцца машыны.

Здаўна лічылася, што дарога — артэрыя жыцця. Не састарэла гэтае паняцце і ў нашы дні. Сучасная якасная аўтатраса — гэта своечасовая дастаўка грузаў і бяспека пасажырскіх перавозак, дзякуючы чаму гарантуецца бесперабойная работа эканомікі і нармальнае функцыянаванне сацыяльнай сферы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

## ЧАТЫРЫ ПАЖАРЫ З-ЗА МАЛАНКІ

**Навальнічны фронт, які прайшоў праз Беларусь у ноч на чацвер, адзначыўся «вогненным» следам у Віцебскай вобласці.**

— Першым маланка падпаліла дом у вёсцы Вайнюны Браслаўскага раёна, — паведамілі ў **Віцебскім абласным упраўленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.** — У ім, аднак, ніхто не пражываў. Агонь знішчыў дах пабудовы, перакрыцці і пашкодзіў сцены.

Па адным пажары адбылося ў Сенненскім і Шумілінскім раёнах. У апошнім стыхія пакінула без даху над галавой 87-гадовую гаспадыню дома. Адзначылася навальніца і непасрэдна ў Віцебску. Электрычны разрад падпаліў дах дома па 7-й Лугавой вуліцы. У ім начавалі муж з жонкай і двое дзяцей. Яны паспелі своечасова выбрацца.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## АЎТОБУСЫ ЗНОЎ ЗАЯЗДЖАЮЦЬ У АЭРАПОРТ ВІЛЬНЮСА

**У сувязі з планаваным завяршэннем рамонту ўзлётна-пасадачнай паласы дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» з 18 жніўня аднаўляе заезды ў аэрапорт Вільнюса.**

Гаворка ідзе пра аўтобусы, якія выконваюць рэгулярныя рэйсы па маршрутах: Мінск—Вільнюс часам адпраўлення штодня з Мінска ў 9.30, з Вільнюса — у 18.30; часам адпраўлення штодня з Мінска ў 12.00, з Вільнюса — у 17.30; часам адпраўлення з Мінска ў 1.35 па нядзелях і панядзелках, з Вільнюса — у 17.00 па нядзелях і ў 8.00 па панядзелках; Мінск—Каўнас часам адпраўлення штодня з Мінска ў 23.30, з Каўнаса — у 18.40.

Таксама дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» будзе выконваць рэгулярныя рэйсы па маршруце Мінск—Рыга адпраўленнем: з 1 верасня з Мінска ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 8.50 (замест 9.50) штодня; з 2 верасня з Рыгі ў 8.50 (замест 08.00) штодня.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## 10 САБАК І 2 КОШКІ

### ўтрымлівалі ў кватэры шматпавярховіка ў Полацку

**Гэта, а таксама ператварэнне жылога памяшкання па вуліцы Дзяржынскага ў звалку стала нагодай для суседзяў звярнуцца нарэшце ў пракуратуру. Разам з пракурорам у «госці» да праблемных жыльцоў завіталі прадстаўнікі цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, ЖКГ і іншых ведамстваў.**

Аказалася, што жыллё належыць 61-гадовай жанчыне і яе 33-гадоваму сыну, абодва — людзі з абмежаванымі магчымасцямі, не працуюць.

— Кватэра знаходзілася ў жудасным з пункту гледжання нармальнага чалавека стане. Былі раскіданы бытавое смецце, брудная вопратка, элементы старой зламанай мэблі, рэшткі прадуктаў харчавання... Акрамя гэтага, «метры» былі забруджаны экскрэментамі жывёл і людзей. Калі дзесяці сабак і дзве кошкі пры адкрыцці дзвярэй у кватэру разбегліся па пад'ездзе і вуліцы, — расказаў журналісту «Звязды» **пракурор Полацкага раёна Сяргей ТРОШКА.**

З-за антысанітарыі ў доме распладзіліся прусакі. Адна з суседак дадала, што пенсіянерка з сынам нярэдка выкарыстоўваюць для задавальнення сваіх фізіялагічных патрэб і месцы агульнага карыстання.

А што камунальнікі? Яны былі ў курсе. Але, як устанавілі ў пракуратуры, дзейснага ўплыву на гаспадароў бруднай кватэры работнікі ЖЭС-3 не аказалі. У прыватнасці, рэдка складаліся пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях. У судзе разгледзелі толькі адну справу ў дачыненні да маці і дзве — да сына. І тыя праігнаравалі парушаць правілы карыстання жылымі памяшканнямі...

— Работнікі ЖКГ не выконвалі належным чынам службовыя абавязкі. Не было сістэмнага і прынцыповага падыходу да кантролю, — лічыць пракурор.

Пасля праверкі пракуратуры інжынера па працы з насельніцтвам ЖЭС-3 прыцягнулі да дысцыплінарнай адказнасці. А «сямейку» аштрафавалі: на 5 базавых велічынь (115 рублёў) — кожнага. Іх абавязалі зрабіць генеральную ўборку.

Што датычыцца жывёл, яны былі адвезены ў прытулак.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

## ГЛАДЫЁЛУС — КАРОЛЬ ЖНІЎНЯ

**Цэнтральны батанічны сад у Мінску запрашае мінчан і гасцей сталіцы на выстаўку гладыёлусаў.**

Жнівень традыцыйна радуе цвіценнем адной з самых арыстакратычных кветак — гладыёлуса. Гэтая расліна мае цікавую гісторыю. Каля 300-га года да нашай эры клубні гладыёлусаў ужывалі ў ежу, запякалі іх ці выкарыстоўвалі ў якасці асновы для праснакоў. Ужо ў І стагоддзі нашай эры гладыёлусы згадваюцца Плініем у сувязі з іх нібыта магічнай сілай, якая засцерагае воінаў ад гібелі і прыносіць перамогу. У якасці амулета воіны насілі цыбулінкі гладыёлуса на шыі.

Лацінская назва расліны паходзіць ад gladius — «меч» і звязана з яе формай: лісце гладыёлуса па форме чымсьці нагадвае шпагі. Яго радзіма — трапічныя і субтрапічныя раёны Афрыкі, Міжземнамор'я, Сярэдняя Еўропа, Заходняя Сібір, Сярэдняя Азія.

Дэкаратыўная калекцыя гладыёлусаў Цэнтральнага батанічнага саду налічвае цяпер каля 900 сартоў. З 18 па 20 жніўня ў экспазіцыі будуць прадстаўлены каля 100 сартоў гладыёлусаў з розных садовых класаў. На выстаўцы можна будзе пабачыць як навінкі селекцыі, так і добра вядомыя, праверaныя часам сарты.

У рамках выстаўкі можна будзе не толькі палюбавацца найбагацейшым светам гладыёлусаў, але і атрымаць прафесійную кансультацыю па іх агратэхніцы ад навуковых супрацоўнікаў батанічнага саду.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## СТАЛІ АХВЯРАМІ ДТЗ

**Ранкам у 7.09 на «101» ад відавочцы сталічным ратавальнікам паступіла паведамленне аб дарожна-транспартным здарэнні на праезнай частцы па вуліцы Мірашнічэнкі, у выніку якога пацярпелі людзі.**



На месцы было ўстаноўлена, што адбылося сутыкненне маршрутнага аўтобуса «МАЗ-103», які рухаўся па маршруце №24 «ДС «Веранянскага — ДС «Зялёны Луг-6» (у ім знаходзіўся адзін пасажыр, які не пацярпеў, як і кіроўца), і легкавога аўтамабіля таксі «Рэно Логан». У выніку дарожна-транспартнага здарэння загінулі два пасажыры таксі. Кіроўцу легкавіка даставілі ў бальніцу ў рэанімацыйнае аддзяленне ў цяжкім стане. Каб дастаць пацярпелых і загінулых з салона машыны, работнікам МНС давялося выкарыстоўваць спецыяльны гідраўлічны інструмент.

* * *

**У Баранавіцкім раёне каля вёскі Дубава адбылася аварыя, у якой загінулі дзве жанчыны.**

Дарожна-транспартнае здарэнне мела месца на скрыжаванні каля 20.15. Аўтамабіль «Мазда 626» выехаў на галоўную дарогу і сутыкнуўся з «Пежо 206», што рухалася па ёй. У выніку загінула жанчына — кіроўца «Мазды» — майстар на прыватным прадпрыемстве, і яе 59-гадовая маці-пенсіянерка, якая сядзела на пярэднім сядзенні. За рулём «Пежо» была 23-гадовая непрацуючая жыхарка вёскі Малая Каўпеніца. Яна ехала адна, шпіталізацыя ёй не спатрэбілася. Заведзена крымінальная справа, міліцыя просіць адгукнуцца сведак аварыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Актуальнае апытанне

# СЯМ'Я БЕЛАРУСКАЯ: што мы аб ёй ведаем?



**У краіне працягваецца даследаванне «Фарміраванне сям'і, стабільнасць сямейных стасункаў і нараджальнасць ва ўмовах змянення сацыяльна-эканамічных умоў жыцця беларусаў». Летнія месяцы яго правядзення выявілі некалькі вострых праблем. Магчыма, увосень апытанні пойдуць лягчэй.**

Работа праводзіцца ў межах іншага глабальнага даследавання, якое праходзіць у свеце пад агульнай назвай «Пакаленні і гендар». Шэраг краін ужо атрымалі карысныя вынікі, а для некаторых усё яшчэ наперадзе. На постсавецкай прасторы першай стала Беларусь, якая яшчэ і апрабуе новыя падыходы па зборы даных ад насельніцтва — з выкарыстаннем планшэтаў. Гэта значыць, ніякіх папяровых носьбітаў: кожны адказ заносіцца інтэрв'юерам у камп'ютар і фактычна адразу апрацоўваецца. Калі вы трапілі ў выбарку, і да вас прыйшоў чалавек з такім апытаннем, не адмаўляйцеся ад удзелу, будзьце шчырыя ў сваіх адказах.

Інтэрв'юеры, а іх па краіне каля тысячы, апыталі пакуль усяго каля 4 тысяч чалавек. Для дакладнасці звестак патрабуецца інфармацыя не менш як васьмі тысячаў. Усе адрасы выбіраліся на падставе рэпрэзентатыўнай выбаркі і на аснове статыстычных звестак. Апытанне прадугледжвае размову на працягу не менш як дзвюх гадзін, яно змяшчае і досыць інтымныя пытанні, накшталт «ці засцерагаліся вы, калі зацяжарылі першы раз?».

— Палявыя работы стартавалі ў сярэдзіне мая, а з пачаткам лета мы сутыкнуліся з тым, што частка людзей адсутнічае па абраных адрасах, — тлумачыць **дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ Давід РОТМАН.** — Як высветлілася, справа не толькі ў часе адпачынку. Немалая частка мужчынскага насельніцтва выехала на заробкі за мяжу, у Расію. Другі момант — статыстычныя звесткі былі прадастаўлены на аснове перапісу насельніцтва за 2009 год, а значыць, туды не трапілі новыя мікрараёны буйных гарадоў. У сталіцы, гэта, напрыклад, 200-тысячнае насельніцтва мікрараёна «Каменная Горка», асноўнымі насельнікамі якога з'яўляюцца маладыя сем'і. Атрымліваецца такім чынам асаблівы перакос ва ўзросце сярод рэспандэнтаў... Пажылыя, дарэчы, з асцярогай ставяцца да занясення іх адказаў у планшэты, яны пытаюцца, ці не запісваюць іх голас, ці не фатаграфуюць, а будучы насцярожанымі, людзі могуць даваць не зусім шчырыя адказы. Разам з тым нашы інтэрв'юеры ўжо навучыліся прапаноўваць насцярожаным людзям пазваніць, напрыклад, па 102 і ўдакладніць, ці сапраўды варта давяраць такому чалавеку. Праваахоўнікі, мясцовая ўлада, безумоўна, у курсе такой работы, аднак пры інтэрв'юеры ёсць і адпаведныя дакументы, пра якія таксама можна яго распытаць...

Сям'я на працягу апошніх 100 гадоў застаецца адным з найважнейшых аб'ектаў сацыяльнай палітыкі многіх краін. Дэмаграфічная статыстыка забяспечвае дзяржаву інфармацыяй аб колькасці і структуры насельніцтва, дынаміцы паказчыкаў смяротнасці і нараджальнасці. У прыватнасці, дэмаграфічныя даследаванні паказваюць, што рэальная нараджальнасць значна ніжэйшая, чым заяўленая ў пажаданнях і намерах жанчын фертыльнага ўзросту. Раскрыць прычыны гэтай з'явы можна толькі метадамі спецыяльных даследаванняў, якія дазваляюць прасачыць жыццёвы шлях жанчын у кантэксце эканамічнай сітуацыі, сацыяльнай палітыкі, адукацыі, складу сям'і, наяўнасці партнёра, сямейных стасункаў і раздзялення дамашняй працы, жыллёвых умоў і магчымасці іх паляпшэння, даступнасці мер планавання сям'і, стану здароўя і г. д. У гэтым даследаванні, у адрозненне ад класічнай дэмаграфіі, вывучаюцца таксама намеры мужчын нарадзіць дзіця з улікам тых жа абставін, а таксама ўзаемасувязь паміж намерамі мужчын і жанчын, звязаных стасункамі.

Больш за тое, падобныя даследаванні дазваляюць супаставіць абставіны, якія мяняюцца пад уздзеяннем сацыяльнай палітыкі і ідэалогіі, з намерам нарадзіць дзіця і ажыццяўленнем гэтага намеру. На першым, сёлетнім, этапе даследавання могуць быць зафіксаваныя толькі намеры, якія існуюць у цяперашні момант, а для кантролю за іх ажыццяўленнем неабходны паўторныя апытанні. Таму галоўная задача гэтай работы — усебаковы разгляд працэсаў фарміравання і жыццядзейнасці сучаснай беларускай сям'і з улікам шлюбных, партнёрскіх стасункаў, стасункаў паміж пакаленнямі, што можа быць узятае за аснову.

— У сусветным маштабе такія даследаванні неабходны для выяўлення падабенства і адрозненняў паміж краінамі, а Беларусі атрыманыя вынікі неабходны для таго, каб вызначыць нацыянальныя прыярытэты ў галіне дэмаграфічнай палітыкі пасля 2020 года, улічыць іх у новых праграмах і дакументах, якія вызначаюць тую ж сацыяльную падтрымку сем'яў, дзяцей, пажылых і г. д., — адзначае **кіраўнік праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Падтрымка рэалізацыі нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь» Марыяна САКАЛОВА.** — Другі важны момант — запаўненне прабелаў у навуковых, акадэмічных даследаваннях па гэтай праблематыцы...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# Адукацыя для жыцця

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Дадатковая адукацыя адыгрывае вельмі важную функцыю, істотна дапаўняючы змест школьнай. Ёй уласцівыя адкрытасць, мабільнасць і гнуткасць, што дазваляе хутка і крохкава рэагаваць на сучасныя адукацыйныя запыты, — падкрэслівае **намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Ларыса ІСАЧКІНА.**

Да таго ж для сістэмы дадатковай адукацыі ўласцівы адкладзены ў часе эфект. Пакуль яна існуе, яе ніхто быццам бы і не заўважае, але як толькі яна знікне, гэта стане відаць усім і адразу. Дадатковая адукацыя не проста дазваляе знайсці сябе — яна мае магутны выхаваўчы патэнцыял: папулярызуе сярод дзяцей і падлеткаў сучасныя прафесіі, развівае іх творчыя і інтэлектуальныя здольнасці, засцерагае ад негатыўнага ўздзеяння вуліцы, ад падлеткавай агрэсіўнасці і дэструктыўных паводзін. Нярэдка хобі становіцца для выхаванцаў справай усяго жыцця. Але нават калі маладыя людзі ў выніку выбіраюць іншы кірунак сваёй прафесійнай самарэалізацыі, яны ўсё роўна больш прыстасаваныя да жыцця, і тыя здольнасці, якія яны развівалі ў аб'яднаннях па інтарэсах, абавязкова дапамагаюць ім у іншых сферах.

Тыя ж выхаванцы гурткоў турысцкага напрамку могуць самастойна паклапаціцца пра сябе і заўсёды знойдуць выйсце з любой складанай сітуацыі. Сёння віртуальная камунікацыя замяніла жывыя зносіны, але яна не можа кампенсаваць развіццё такой якасці, як лідарства. Толькі ўявіце сабе, якую глебу для фарміравання лідараў дае звычайны турысцкі паход! Вось чаму педагогі дадатковай адукацыі называюць яе адукацыяй для жыцця.

Дарэчы, у маі бягучага года на базе Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі быў створаны крэатыўна-інавацыйны Маладзёжны цэнтр, скіраваны на падтрымку і развіццё дзіцячых і маладзёжных грамадскіх ініцыятыў. Сярод яго найбліжэйшых мерапрыемстваў — правядзенне 1 і 2 верасня ў Полацку рэспубліканскага дзіцяча-маладзёжнага форуму «Жыць і працаваць на роднай зямлі». У кастрычніку пройдзе рэспубліканскі конкурс «Дзіцячы і маладзёжны парламент», а ў лістападзе — рэспубліканскі конкурс юных журналістаў «Ты ў эфіры».

Па словах **дырэктара Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці Сяргея САЧКО,** сёння на хвалі цікаўнасці ў падрастаючага пакалення знаходзяцца інфармацыйныя тэхналогіі і робататэхніка. У 2015 годзе, калі гэты кірунак толькі пачаў развівацца, пры ўдзеле Міністэрства сувязі першапачаткова па краіне (у сталіцы і рэгіёнах) было прафінансавана стварэнне сямі пляцовак. Праз год дзейнічала ўжо 70 такіх пляцовак, а сёння мы кажам пра 90 аб'яднанняў па робататэхніцы. Паралельна з дзяржаўнымі аб'яднаннямі па інтарэсах гэты кірунак актыўна развіваюць і прыватнікі. Але маніторынг цэн паказаў, што памер бацькоўскай платы за такі гурток у дзяржаўных аб'яднаннях удвая меншы, чым у канкурэнтаў-прыватнікаў (40 рублёў у месяц, а не 80 рублёў).

Увогуле, на рэспубліканскім узроўні, у абласных цэнтрах доля платных гурткоў і секцый вагаецца ў межах ад 10 да 30 працэнтаў. У той жа час ёсць рэгіёны, дзе ўсе аб'яднанні па інтарэсах застаюцца бясплатнымі.

— Адукацыйны працэс у нашым цэнтры рэалізуецца як па традыцыйных кірунках, такіх, як тэхнічнае мадэляванне і канструяванне, суднамадэляванне, авіямадэляванне, радыётэхніка і радыёэлектроніка, так і па кірунках, заснаваных на інавацыйнай творчасці, — падкрэслівае Сяргей Сачко. — У новым навучальным годзе мы будзем ажыццяўляць набор на мабільную і прамысловую робататэхніку, 3D-мадэляванне, інжынерны дызайн CAD, прататыпаванне, нейрапілатаванне, кіберспорт, тэхналогіі беспілотных лятальных апаратаў.

Сёння цэнтр каардынуе дзейнасць 175 шматпрофільных і 13 аднапрофільных устаноў дадатковай адукацыі ў галіне рэалізацыі праграм тэхнічнага і спартыўна-тэхнічнага профіляў. Практычныя заняткі ў аб'яднаннях па інтарэсах Цэнтра становяцца эксперыментальнымі лабараторыямі, у якіх апрабоўваюцца самыя прагрэсіўныя метадыкі навучання і выхавання.

**Рэспубліканскі цэнтр інавацыйнай і тэхнічнай творчасці развівае і дыстанцыйную форму навучання:** школьнікаў запрашаюць у «Марскі клуб», клубы «Тайны псіхалогіі», «Дамашні самадзелкін» і тэхнічнай творчасці. Для гэтага дастаткова мець дома камп'ютар з доступам у інтэрнэт, электронны паштовы адрас і ўліковы запіс у Skype.

Развівае дыстанцыйную форму таксама і Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства: тут дзейнічаюць дыстанцыйныя школы па музейнай справе і геаграфіі. У новым навучальным годзе цэнтр уключаецца ў эксперыментальны праект па вывучэнні магчымасцяў дапрофільнай падрыхтоўкі ва ўстановах дадатковай адукацыі. У праекце будуць задзейнічаны таксама Полацкі раённы цэнтр дадатковай адукацыі, Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі, адна з мінскіх гімназій і Мінскі абласны ліцэй.

— Будзем думаць, як нам узмацніць эколага-біялагічны профіль у школе, праводзіць лабараторныя практыкумы, пераглядаць нашы праграмы, — расчумачыла **дырэктар цэнтра Алена АНУФРОВІЧ.**

Спецыялісты заўважылі, што апошнім часам бацькі школьнікаў, зацікаўленыя ў іх канкурэнтаздольнасці, актывізаваліся: калі раней яны «прачыналіся» толькі ў верасні, то цяпер актыўна цікавяцца магчымасцямі ўстаноў дадатковай адукацыі яшчэ летам. Для такіх бацькоў Тыдзень устаноў дадатковай адукацыі — вельмі добрая магчымасць асабіста завітаць і пазнаёміцца з іх рэсурсамі, адукацыйнымі праграмамі, а яшчэ сустрэцца з псіхолагам і педагогамі. Бо ўсё ж, напэўна, не ўсім дадзена стаць інжынерам ці канструктарам, палюбіць фізіку ці ландшафтны дызайн, захапіцца арніталогіяй або касмічнай біялогіяй, скалалажаннем ці турызмам. Дзесьці патрабуецца максімальная канцэнтрацыя і ўважлівасць, а дзесьці, наадварот, трэба быць разняволеным...

Дарэчы, псіхолагі лічаць, што бацькі ні ў якім разе не павінны аказваць ціск на сваё дзіця пры выбары таго ці іншага гуртка, клуба або секцыі. Толькі занятак па душы можа прынесці рэальную карысць. А вызначыцца з выбарам адразу могуць не ўсе. Знаходзіцца ў працэсе пошуку — гэта нармальны стан любога дзіцяці, якое жадае самарэалізавацца. Хтосьці можа прыйсці і застацца надоўга, хтосьці пойдзе далей, будзе шукаць свайго педагога, пакуль яму не стане і цікава, і камфортна.

Ні для каго не сакрэт, што паміж школьным настаўнікам і педагогам дадатковай адукацыі існуе прынцыповая розніца: калі першага дзеці не выбіраюць, а хадзіць у школу па веды — гэта іх, так бы мовіць, абавязак, то прымусіць дзяцей наведваць гурток ці секцыю проста немагчыма, калі ім там нецікава. А ў час глабальнага развіцця інтэрнэту завяваць, а тым больш утрымаць увагу дзяцей і падлеткаў вельмі складана...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Актуаліі

## Хочаш — не хочаш, а 11 класаў скончы!

**Міністэрства адукацыі выступіла з ініцыятывай аб пераходзе да абавязковай для ўсіх вучняў сярэдняй адукацыі. Гэта тэма стане адной з галоўных на рэспубліканскім педагагічным савеце. У міністэрстве лічаць такі крок лагічным і апраўданым і прыводзяць як мінімум пяць аргументаў «за».**

1. Павышэнне агульнага адукацыйнага ўзроўню. Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі дасць магчымасць павысіць агульны адукацыйны ўзровень насельніцтва. Акрамя таго, ён стане важным крокам да больш паспяховай сацыялізацыі маладых людзей. У адзінаццацікласніка ў параўнанні з дзевяцікласнікам магчымасцяў значна больш — нават проста з-за ўзросту...

2. Усеагульная сярэдняя адукацыя сёння дзейнічае ў большасці развітых краін свету. Дзесьці яна вылічаецца класамі, а недзе за аснову бярэцца ўзрост. Напрыклад, у Расіі патрабаванне аб абавязковасці агульнай сярэдняй адукацыі захоўвае сілу да 18 гадоў. У Кодэксе аб адукацыі Беларусі пераход да абавязковай агульнай сярэдняй адукацыі пазначаны як адна з асноў дзяржаўнай палітыкі.

3. Работа над іміджам краіны. Гэты аспект вельмі важны, паколькі пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі для Беларусі — яшчэ адно сведчанне сталасці і зладжанасці айчыннай сістэмы адукацыі.

4. Вопыт ужо ёсць. Усеагульная сярэдняя адукацыя для Беларусі не ў навіну: «усенавуч» памятаюць яшчэ з часоў Савецкага Саюза, калі поўную сярэднюю адукацыю атрымлівалі ўсе і ў абавязковым парадку.

5. Ломкі не будзе. Сістэма адукацыі ў Беларусі гатовая да работы ў абноўленым фармаце. Праводзіць якія-небудзь структурныя змены няма неабходнасці. Мяняць змест праграм установ сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі таксама не плануецца. У выпускніка 9-га класа ёсць некалькі шляхоў для таго, каб атрымаць агульную сярэднюю адукацыю: ён можа пайсці ў 10—11-я класы або паступіць у сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову, або ва ўстанову прафтэхадукацыі, дзе будзе адначасова атрымліваць і прафесію, і агульную сярэднюю адукацыю. У выпадку пераходу на ўсеагульную сярэднюю адукацыю ўсе гэтыя магчымасці за дзевяцікласнікам захаваюцца, тлумачаць у міністэрстве.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Я НЕ ГЛЯДЖУ ТЭЛЕВІЗАР,

## або Гэта ж маё любімае шоу!

**Не, я зусім не памылілася ў выбары загалоўка, і яго гучанне непарадаксальнае. Хутчэй наадварот, вельмі лагічнае і адпаведнае часу, трэндам і з'явам у масавай культуры спажывання відэаінфармацыі. Многія сёння з гонарам заяўляюць, што не глядзяць тэлевізар і нават не маюць дома гэтай надакучлівай скрынкі (ці ўжо хутчэй плоскай каробкі) з экранам, якая забірае так шмат часу і ўвагі. Але ж насамрэч, нават не маючы тэлевізара дома, не гледзячы яго вечарамі ўсёй сям'ёй (як у дзяцінстве), мы не перастаём быць спажыўцамі прадуктаў тэлевізійнай вытворчасці. Толькі ў новым фармаце.**
**І з іншых крыніц. І часам кантэнт, які мы самі для сябе фарміруем, больш якасны, чым тое, што прапануе стандартная праграма тэлеперадач. Але ж мы ўсё роўна застаёмся гэткімі ж залежнымі ад прысутнасці відэа ў нашым штодзённым жыцці.**



### Уладарыць відэа

«Было б выдатна, калі б атрымалася зняць відэаролік і дапоўніць ім тэкст на нашым сайце» — прапановы-заданні такога кшталту вельмі часта чуюць на планёрках прадстаўнікі розных СМІ. Ды і самі мы, чытаючы навіны, не-не ды і паглядзім відэа, што суправаджае інфармацыю. Гэта можа быць як ролік, адмыслова зняты журналістамі, так і абсалютна выпадковыя кадры з камер відэаназіранняў ці відэарэгістратараў аўто. Нам мала проста тэксту, фотаздымкаў таксама недастаткова — толькі відэа можа стаць больш-менш важкім пацвярджэннем істотнасці падзеі, уразіць нас і на даўжэйшы час застацца ў памяці.

> **«Дзіўна, але я буду пісаць навуковую гістарычную манаграфію пра тыя падзеі, якіх ніколі не адбывалася».**

Больш за тое, мова відэа амаль універсальная для прадстаўнікоў розных народаў, жыхароў розных кантынентаў. Ды і доўгія тэксты патрабуюць больш часу для знаёмства, чым кароткія відэасюжэты. Таму, каб быць у курсе таго, што адбываецца ў свеце, карыстальніку інтэрнэту сёння неабавязкова ўмець чытаць і пісаць — дастаткова мець досыць магутны смартфон-планшэт (а з гэтым сёння пытанняў узнікае ўсё менш і менш).

### «Там жа Кацька сварыцца з Дзімкам!»

Кажуць, звычка — другая натура, таму многія бізнес-праекты, якія сталі паспяховымі, былі ад самога пачатку скіраваныя на фарміраванне ў пакупнікоў, спажыўцоў устойлівай звычкі да іх выкарыстання. Вось чаму высокія рэйтынгі ў медыя дасягаюць серыяльныя вытворчасці рознага кшталту. Тут ключавымі з'яўляюцца паняцці паўтаральнасці, знаёмасці, часавай прывязанасці. Мы ведаем усіх герояў, сочым за адным і тым жа сюжэтам, разам з тым штораз атрымліваем порцыю новай інфармацыі, можам прадказваць наступныя крокі, рабіць прагнозы... І я тут кажу не толькі пра класічныя тэлесерыялы, але і пра рэаліці-шоу, якія, не маючы дакладнага сюжэта (але маючы прадуманую стратэгію развіцця), будуюцца па тым жа прынцыпе.

Не так даўно адзін мой прыяцель, досыць вядомы беларускі пісьменнік, уганараваны некалькімі прэміямі за кнігі паэзіі і прозы, у гутарцы прызнаўся, што «падсеў» на рэаліці-шоу «Дом 2». Захапіўся і сам не заўважыў калі. Спачатку проста слухаў адным вухам, бо ўключаў канал крыху раней, баючыся прапусціць любімы мультфільм, потым глядзеў адным вокам, не аддаючы шмат увагі развіццю падзей. Але ў нейкі момант, паўтараючы штодзённы рытуал, злавіў сябе на тым, што ўважліва глядзіць шоу з думкай: «Кацька сварыцца з Дзімкам, як цікава!» Паступова, пацыху і неўсвядомлена для яго самога мой сябар стаў успрымаць герояў з тэлеэкрана як сваіх знаёмых ці суседзяў, таму і зацікавіўся іх стасункамі. А як наступства — стаў прыхільнікам «Дома 2»...

### Стваюцца новыя сусветы...

І калі так лёгка трапіць у залежнасць ад не зусім якаснага па змесце відэасерыяла, то што ўжо казаць пра вытанчаныя, бездакорныя і фінансава добра забяспечаныя тэлепраекты? Некаторыя з іх сталіся цэлымі эпохамі, пасля іх, можна дакладна сказаць, свет тэлебачання не будзе ранейшым. Мыльная «Санта-Барбара», якая ўсім паспела надакучыць, сімпатычныя «Сябры», пасля якіх скляліся фактычна каноны маладзёжнай камедыі, нарэшце, «Гульня тронаў». Дарэчы, Джордж Марцін, аўтар серыі раманаў, што леглі ў аснову гэтага серыяла, некалькі дзён таму падчас прэс-канферэнцыі ў расійскім агенцтве «ТАСС» прызнаўся, што сам здзіўлены такому нечуванаму поспеху, той папулярнасці, што здабыў створаны ім сусвет. Але наконт механізма фарміравання цікавасці пісьменнік разважаў так:

— Яшчэ Толкін у сваіх раманах паказаў, наколькі важна дэталёва распрацоўваць апісанні месцаў, дзе адбываюцца падзеі фэнтэзійнага свету, у якіх дзейнічаюць і жывуць героі. Месцы становяцца пазнавальнымі, і хоць іх не існуе ў рэчаіснасці, але яны існуюць у нашай свядомасці. Які б мастак у якім бы стылі ні намаляваў толкінаўскае каралеўства, мы яго пазналі б. Да яго аўтары, якія стваралі фэнтэзі, пісалі хутчэй казкі, не акцэнтуючы ўвагу на дэталях, часам нават не даючы імёнаў героям і не прыдумваючы назваў мясцінам, таму і не набліжалі іх да чытача і гледача.

Парадаксальна, але часам прыдуманыя гісторыі, героі, сусветы цікавяць чытача, гледача намнога больш, чым падзеі, што адбываліся ў рэчаіснасці, і лёсы асоб, што насамрэч жылі. Той жа Марцін цяпер са здзіўленнем назірае, як свет «Гульні тронаў» пачынае жыць сваім жыццём і нават сам кіруе яго творчасцю. Зусім нечакана для сябе аўтар вырашыў напісаць яшчэ адну галіну гэтай вялікай гісторыі (як сказалі б кіношнікі, спін-оф), расказаць пра дынастыю Таргарыенаў, аднаго з каралеўскіх родаў Вестэроса. «Дзіўна, але я буду пісаць навуковую гістарычную манаграфію пра тыя падзеі, якія ніколі не адбываліся», — прызнаецца аўтар.

### Улад А4 на далоні

— Мама, а як ты ставішся да таго, што твой сын — папулярны відэаблогер? Хто твой любімы відэаблогер? Так, гэта я, Улад. Так, ты трапіла ў маё відэа.

Не, гэта не проста набор фраз, а прыкладны пераказ аднаго з выпускаў блога Улада А4, або Улада Бумагі.

Узрастанне папулярнасці і ўплывовасці блогераў, іх каналаў і захапленне падлеткаў гэтай параўнальна новай з'явай інтэрнэт-прасторы ўжо зацікавіла медыяаналітыкаў і культуролагаў. Мы маем справу з новым пакаленнем, новымі сродкамі камунікацыі, новым падыходам да выбару медыя. Каб выйсці да публікі, заявіць пра сябе, сёння дастаткова мець смартфон і завесці свой канал на youtube. А потым — калі зоркі складуцца — вашы відэа будуць набіраць мільёны праглядаў, вы самі станецеся кумірам моладзі, дзяўчаты/хлопцы будуць марыць хоць нейк трапіць у выпуск відэаблога, і магчыма нехта з прыхільнікаў нават зробіць на далоні татуіроўку з лагатыпам канала (а Улад Бумага такую тату свайму падпісчыку ўжо зрабіў і прысвяціў гэтаму працэсу цэлы выпуск).

Магчыма, прыцягальнасць вобразаў блогераў і іх каналаў у тым, што амаль сціраецца мяжа паміж гледачом і асобай на экране. З ім можна пасябраваць у сацсетках, ён можа жыць у суседнім доме ці вучыцца з вамі ў адной школе, насіць такую ж майку і такую ж прычоску, як і вы. А можа, тут ключавое якраз разуменне: кожны можа стаць зоркай, і для гэтага неабавязкова мець шмат грошай ці ўплывовых сваякоў. Дастаткова проста харызматычнасці, стараннасці і крэатыўнасці.

### Прысутнасць тут і цяпер

Відэа дазваляе нам перамяшчацца ў прасторы. Факт. Але яго прыцягальнасць яшчэ і ў магчымасці зазірнуць у куткі, часам самыя неймаверныя, куды сам чалавек ніколі ў жыцці і не змог бы трапіць. Напрыклад, гняздо ястраба, дзе толькі-толькі выведіся птушаняты, пустыня, у якой жывуць ільвы і жырафы, пабачыць, што цяпер адбываецца на знакамітай Эбі Роўд з вокладкі альбома The Beatles, чым жыве Таймс Сквер у Нью Ёрку і як вось проста цяпер гучыць Ніягарскі вадаспад. Такую магчымасць даюць вэб-камеры, устаноўленыя ў розных мясцінах свету, якія круглыя суткі працуюць у рэжыме анлайн. Дастаткова толькі зрабіць запыт у пошукавіку — і ўвесь свет апынецца перад вамі. Падаецца, што гэта выдатны спосаб памедытаваць і цудоўная альтэрнатыва традыцыйным каналам, прысвечаным жывёльнаму свету.

### Ці варта глядзець?

Яны «забіваюць час», спрашчаюць мысленне, напаўняюць наш мозг не зусім патрэбнымі фактамі... Але відэа, што мы глядзім, прыносіць і шмат карысці: любімым блогерам можа стаць той, хто расказвае пра навуковыя адкрыцці і кніжныя навінкі, вэб-камера з Індыі можа падштурхнуць да падарожжа ў рэчаіснасці, а любімы серыял — гэта не абавязкова мыльная опера, але і высокаінтэлектуальны дэтэктыў. Ды самае галоўнае — тое задавальненне, што мы атрымліваем ад прагляду відэа. Вечарам пасля працы, на ўтульнай канапе, з кубачкам кавы, у цёплай кампаніі знаёмых герояў... Зрэшты, трэба ж некалі адпачываць, перазагружаць свядомасць, хай і выкарыстоўваючы для гэтага не зусім «разумныя» сродкі.


**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*


## Ці ёсць канкурэнцыя?

**Выбар — гэта заўсёды добра. Але ж тэлебачанне — індустрыя, у якой працэ вялікая колькасць спецыялістаў рознага кшталту — вядучых, рэжысёраў, аператараў, грымёраў... Ці не баяцца яны канкурэнцыі з блогерамі і youtube?**

***Аксана ВЕЧАР, вядучая, аўтар музычных праграм:***

— Безумоўна, для гледача карысна, што з'явіліся новыя крыніцы і спосабы прадстаўлення інфармацыі ў медыя. Але асабіста я жыву ў сваім свеце і не звяртаю асаблівa шмат увагі на гэтыя сучасныя трэнды. У той жа час не адмаўляю ў карысці youtube, скажам, для музыкаў, якія хочуць стаць папулярнымі. Напрыклад, Віталік Карпанаў здымае кліпы, якія не патрабуюць вялікіх грашовых сродкаў, але іх дастаткова — хай не для падачы ў тэлеэфіры, але для раскруткі ў сацыяльных сетках. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму для фарміравання і падтрымання папулярнасці музыкантаў патрэбныя былі высілкі цэлай групы людзей. Гэта і кліпы, і музычныя тэлепраграмы... Але ў цэлым разважанні пра смерць тэлебачання — з кагорты думак пра смерць папяровай кнігі. Так, яно мусіць мадыфікавацца, але ў тым ці іншым выглядзе, безумоўна, застанецца.

***Наталля БАРДЗІЛОЎСКАЯ, журналістка Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі:***

— Тэлебачанне мае большую і шырэйшую аўдыторыю, чым любы інтэрнэт-рэсурс. Маладзёжныя блогі разлічаныя і спрацоўваюць на моладзь, а тэлебачанне — для ўсіх. За навінамі на розных каналах сочаць гледачы рознага ўзросту, сацыяльных катэгорый. Да таго ж пакуль не назіраецца ўсеагульнай камп'ютарызацыі, а тэлевізар даступны кожнаму і выклікае больш давер.

***Дзяніс ГАНЧАРЭНКА, рэдактар дырэкцыі спартыўнага вяшчання СТБ:***

— На маю думку, відэаблогеры і youtube ўжо даўно перасягнулі тэлебачанне ў плане папулярнасці. У наступныя гады, думаю, сітуацыя для тэлебачання толькі пагоршыцца. Моладзь ужо даўно адмовілася ад прагляду тэлебачання на карысць youtube, а ТБ глядзяць пераважна сталыя людзі. Адзінае выйсце для ТБ-каналаў — ствараць свае афіцыйныя акаўнты на youtube і прасоўваць кантэнт праз іх. Але падача інфармацыі ў блогераў досыць нефармальная і часта «прыпраўленая» вострым гумарам, што і прыцягвае гледачоў, каналы не могуць сабе дазволіць такія «вольнасці», яны мусяць падаваць інфармацыю ў больш сур'ёзным і афіцыйным ключы. На сучасным youtube гэта не надта канкурэнтаздольная стратэгія.

***Аляксандр ЯСЮЛЕВІЧ, аператар Белтэлерадыёкампаніі:***

— Тэлебачанне сумяшчае вялікую колькасць разнастайнага відэакантэнту, і я не думаю, што блогеры складаюць нам канкурэнцыю. Падаецца, што сучасны фармат блогерства хутка стане неактуальным, ён паступоваператворыцца ў больш якасны, набліжаны ці аналагічны тэлевізійнаму. Таму не баюся, што мае веды і ўменні будуць незапатрабаванымі.




## Субота, 26 жніўня

### Беларусь 1

**6.20** Існасць.
**6.45 Меладрама «Майскі дождж». (12+).**
**8.20** Кулінарная дыпламатыя. (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Здароўе. (12+).
**10.00** Дача. (12+).
**10.35** Вялікі сэлфі-тур. (12+).
**11.10** 50 рэцэптаў першага. (12+).
**12.10 Серыял «Байкі Міцяя». (12+).**
**13.15, 15.45 Меладрама «Я ведаю твае сакрэты». (12+).**
**15.15** Краіна.
**17.30, 21.40 Меладрама «Залатая клетка». (16+).**
**21.00** Панарама.
**1.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** М/с «Сябры анёлаў». (6+).
**7.45 Фільм для дзяцей «Кароль-жабяня». (12+).**
**8.45, 22.05** Тэлебарометр.
**8.50 Серыял «Шчаслівыя разам-5». (16+).**
**9.50, 19.20** «Тата папаў». (16+).
**12.10** «Свет навыварат». Трэвел-шоу. (16+).
**12.55** Анімацыйны фільм «Монстры на канікулах». (12+).
**14.55** Капейка ў капейку. (12+).
**15.30** «Вяселле ўсляпую». Рэаліці-шоу. (16+).
**16.50 Камедыя «Дзетка». (16+).**



**18.35** Рэпарцёр. (16+).
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

**22.10** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці. (16+).
**23.25 Фантастыка «Тор». (12+).**

### Беларусь 3

**7.40** «Сіла веры».
**8.05, 12.20, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.35, 20.30** «Гэты дзень».
**8.25** «Беларуская кухня». Крупнік і гамолкі.
**8.50 «Нябесныя ластаўкі». Мюзікл. (12+).**
**11.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» Замкавае кола (6+).
**11.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.55** «Навукаманія» (6+).
**12.40 «Фантамас супраць Скотланд-Ярда». Камедыя (12+).**
**14.15** «Майстры і куміры». Народны артыст СССР Генадзь Аўсяннікаў.
**15.10** «Песні мінулага стагоддзя». Канцэрт памяці Уладзіміра Мулявіна.
**16.05 «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм (12+).**
**18.05** «Апошні дзень». Фаіна Ранеўская (12+).
**18.40 «Першы дзень міру». Драма (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Выйсці замуж за капітана». Меладрама (12+).**
**22.30 «Аксамітныя ручкі». Камедыя (12+).**

### Беларусь 5

**7.40** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Нёман» (Беларусь) — «Вена Кэпіталз» (Аўстрыя).
**9.30** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Віцязь» (Маскоўская вобл.).
**11.25, 16.25** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету.
**13.15** Козел пра футбол.
**13.35** Вялікі спорт. Ток-шоу.
**14.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. 3-і тур. «Борнмут» — «Манчэстэр Сіці».
**18.25** Хакей. Кубак Руслана Салея. Першы этап. «Дынама» (Маладзечна) — «Юнацтва» (Мінск). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)

**20.35** Барацьба. Чэмпіянат свету.
**22.00** Спорт-цэнтр.
**22.10** Тэніс. Турнір WTA. Нью-Хэйвэн. Фінал.
**0.05** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Расія — Славенія.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**7.05 «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Серыял (16+).**
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды» (0+).
**9.20** «Здароўе» (16+).
**10.30** «Смак» (12+).
**11.10** «Ідэальны рамонт» (12+).
**12.10** Да юбілею Ірыны Скобцавай. «Мы ўжо ніколі не растанемся...» (12+).
**13.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраоптам» (12+).
**14.15 Маст. фільм «Прыходзьце заўтра...» (6+).**
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту
**16.20** «Тэорыя змовы» (16+).
**17.20 Маст. фільм «Апякун» (12+).**
**19.00** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+).
**21.05** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**21.10** «Сёння ўвечары» (16+).
**22.40** «КВЗ». Прэм'ер-ліга (16+).
**0.10 Маст. фільм «Сярожа» (12+).**

### СТБ

**6.25 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**7.15** «Тайны Чапман» (16+).
**8.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**8.55** «Рамонт па-сумленнаму» (16+).
**9.40** «Самая карысная праграма» (16+).
**10.30** «Тэледоктар» (12+).
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Наша непераможная зброя» (12+).
**13.05** «Вадзіць па-руску» (16+).
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».

**13.45, 1.00 Драма «Некалькі дзён з жыцця Абломава», 1-я серыя. (12+).**
**15.00** Канцэрт Міхаіла Задорнава (16+).
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Забойства ад Куцюр» (16+).
**17.35 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца. Смяротны ўлоў». (12+).**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Засакрэчаныя спісы. Новыя прароцтвы: што чакае Расію?» (16+).
**21.50 «Жорсткі бізнес». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00, 8.20** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**7.50** «Саюзнікі» (12+).
**9.00** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.30** «Любімыя акцёры 2.0» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабыток рэспублік» (12+).
**10.45, 1.30 Маст. фільм «Злодзеі ў законе» (16+).**
**12.30** «Любімыя акцёры» (12+).
**13.05 Маст. фільм «Зіта і Гіта» (12+).**
**16.15, 19.15 Серыял «Іншае» (16+).**
**22.00 Серыял «Ідэальны мужчына» (12+).**
**3.00 Маст. фільм «Вас чакае грамадзянка Ніканорава» (12+).**
**4.20** М/ф (0+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху» (16+).
**7.40 Серыял «Хуткая дапамога» (12+).**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі» (12+).
**12.10** «Пяцёра на аднаго» (12+).
**13.00** «Наша справа» (16+).
**13.15** «Пакой смеху» (16+).
**14.15** «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт (16+).
**16.30 Маст. фільм «Удавец» (12+).**
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.45** «Суботні вечар» (12+).

**22.20 Маст. фільм «Шчаслівае жыццё Ксеніі» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10** «Ты супер!» (6+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
**8.55** «Муслім Магамаеў» (12+).
**9.45** «НЗ.by».
**10.25** «Галоўная дарога» (16+).
**10.55** «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
**11.55** «Кватэрнае пытанне» (0+).
**13.00** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.10 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**17.10** «Сакрэт на мільён». Філіп Кіркораў, частка 2-я (16+).
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55 Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**
**23.55** «Аднойчы...» (16+).
**0.05** «Экстрасэнсы супраць дэтэктываў» (16+).

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.10, 21.10, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка».
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**9.40 «Сінематограф». Камедыя «Дыханне скандалу» (16+).**
**11.20 Меладрама «Каханне і галубы» (16+).**
**13.05 Камедыя «Міміно» (12+).**
**14.40** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Замбезія».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**16.30 Серыял «Эксперт» (16+).**
**17.25 Драма «Пашпарт» (16+).**
**19.15 Камедыя «Лёгкія паводзіны» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**21.15 Камедыя «Містар і місіс Сміт».**
**23.05** М/ф для дарослых.

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер». (16+).
**7.00** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**8.00** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**9.00, 3.20** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**9.20, 3.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.40** М/ф «Маша і Мядзведзь». (0+)
**10.00** М/ф «Аліса ведае, што рабіць!» (6+)
**10.30** «Ералаш». (6+)
**11.20** Анімацыйны фільм «Хортан». (0+).
**13.00** Серыял «Пушкін». (16+).
**15.00** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях». (12+).
**17.20** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі». (12+).
**19.30** Прыгоды «Захавальнік часу». (12+).
**22.00** «Уральскія пельмені». (16+).
**0.00** Баявік «Сабатаж». (18+).
**1.50** «Імперыя ілюзій: браты Сафронавы». (16+).
**4.00** «Лаві момант». (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі». (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Звычайны канцэрт».
**10.35** Да юбілею Ірыны Скобцавай. «Атэла». Маст. фільм.
**12.20** «Гатчына. Адбылося». Дак. фільм.
**13.05, 0.55** «Кароль кенгуру». Дак. фільм.
**13.50** «Зламаныя парасткі, або Кітаец і дзяўчына». Маст. фільм.
**15.30** «Хто там...»
**16.00** Вялікая опера — 2016.
**17.50, 1.55** Па слядах тайны. «Неверагодныя артэфакты».
**18.35** «Лінія жыцця». Канстанцін Хабенскі.
**19.35** «Шумны дзень». Маст. фільм.

**21.10** «Рамантыка рамансa». Савецкая песня 70-х.
**22.05** «Вялікі самазванец». Маст. фільм.
**23.55** «Іншы Канчэлі». Канцэрт у Тбілісі. Запіс 2014 года.
**1.40** «Доўгі мост у патрэбны бок». «Вецер уздоўж берага». М/ф для дарослых.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока. Аляксей Хвасценка». 2006 год (16+).
**7.05, 9.40, 11.00, 13.05, 14.10, 15.40, 17.00, 19.05, 20.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.10** Фільм-спектакль «Сваякі». 1981 год (16+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1962-гі. 2010 год (16+).
**13.30** Тэлеспектакль «Цёмныя алеі». 1968 год (16+).
**16.00** «Колба часу» (16+).
**17.40** Маст. фільм «Перапынак». (16+).
**19.20** Маст. фільм «Небяспечны ўзрост». (16+).
**21.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**22.00** Маст. фільм «Безыменная зорка». (16+).
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год (12+).
**1.00** Тэлеспектакль «Спяшайцеся рабіць дабро». Маскоўскі тэатр «Сучаснік». 1982 год (12+).

### EuroSport 1

**4.00, 6.45, 9.30, 16.15, 21.00, 1.00** Веласпорт. «Вуэльта».
**5.30** Тэніс. Australian Open. Жанчыны. Фінал.

**8.15** Тэніс. Australian Open. Мужчыны. Фінал.
**11.00, 19.00** Універсіяда. Лёгкая атлетыка.
**14.30** Веласпорт. «Тур дэ л'Авенір».
**16.00, 18.45** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
**20.00, 0.00** Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы.
**22.00, 2.30** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**23.00** Ралі. ERC.
**23.30** Барацьба. Чэмпіянат свету.

### Кінакамедыя

**0.40** Камедыя «Уцекачы». (12+).
**2.15** Камедыя «Няголены нянь». (16+).
**3.50** Камедыя «Аперацыя «Тушонка». (16+).
**5.45** Камедыя «Вячэра з прыдуркам». (12+).
**7.10** Камедыя «Аксамітныя ручкі». (16+).
**9.00** Камедыя «Усё пуцём!» (16+).
**10.40** Камедыя «Дзень радыё». (16+).
**12.30** Камедыя «Хутчэй за трусоў». (16+).
**14.15** Камедыя «К-9: калядныя прыгоды». (12+).
**16.00** Камедыя «Усё або нічога». (16+).
**17.55** Камедыя «Вулкан страсцей». (12+).
**19.30** Меладрама «Каханне і іншыя абставіны». (16+).
**21.25** Камедыя «Пяць нявест». (16+).
**23.20** Фантастыка «Жалезнае неба». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Усё па фэн-шую» (12+).
**11.00** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.50, 2.25** «Замуж пасля ўсіх». Серыял (16+).

**15.20** «Школьны вальс». Маст. фільм (12+).
**17.00** «Жанна, пажані» (16+).
**18.00** «Вяселле і развод» (16+).
**18.50, 5.30** «10 самых» (16+).
**19.25, 1.40** «Хэлоў, Раша!» (16+).
**20.20** «Давайце пазнаёмімся». Маст. фільм (12+).
**22.15** «Каўбоі супраць прышэльцаў». Фантастыка (12+).
**0.20** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).

### ТБ1000

**6.10** Ева: штучны розум (12+).
**8.10** Іншыя (16+).
**10.25** Дывергент (12+).
**13.10** Інтэрв'ю з вампірам (16+).
**15.30** Фрэнк (16+).
**17.30** Мачаха (12+).
**20.10** Дывергент-2: інсургент (12+).
**22.25** Прывітанне, Джулі! (16+).
**0.15** Гульня ў імітацыю (16+).
**2.25** Паляўнічыя на троляў (16+).
**4.05** Марыя-Антуанета (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Аднойчы (16+).
**8.20** Легенда №17 (12+).
**10.55** Чалавек з будучыні (16+).
**12.25** Якая бяжыць па хвалях (6+).
**14.25** Сувязь (16+).
**16.10** Мой зводны брат Франкенштэйн (16+).
**18.25** Шчаслівы выпадак (16+).
**20.20** Дом на абочыне (16+).
**22.25** Хутчэй, чым трусы (16+).
**0.20** ПіраМММіда (16+).
**2.30** Шык (12+).
**4.20** Крыжаносец (16+).

### National Geographic

**6.00, 11.50, 13.40** Гульні розуму. (12+).
**6.50, 3.55, 5.10** Зрабі або памры. (12+).
**7.35, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.55, 16.20** Інжынерныя ідэі. (12+).
**10.20, 14.50** Сапраўдны супергер. (12+).
**14.05** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**15.35** Мегазаводы. (12+).
**17.05** Другая сусветная вайна: асушэнне акіяна. (12+).
**17.55, 21.00, 0.50** Прарыў. (12+).
**18.40, 21.45** Неверагодныя машыны. (12+).
**19.25** Навука будучыні. (12+).
**20.10, 1.35** Пачатак. (12+).
**22.30, 2.25** Паранармальнае. (16+).
**23.20** Даследчык. (18+).
**0.05** Дзіўная Другая сусветная. (16+).
**3.10** Секунды да катастрофы. (16+).

### Discovery

**8.00** Бітвы робатаў. (12+).
**9.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**10.00** Загадкі планеты Зямля. (16+).
**11.00, 23.00** Горад навыварат. (12+).
**12.00** Скаваныя: джунглі Камінa Рэаль. (12+).
**13.00, 1.00** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**14.00, 22.00** Гульня на жыццё. (12+).
**15.00** Інжынерныя пралікі: праца над памылкамі. (12+).
**16.00** Багажныя войны. (12+).
**19.00, 0.00** Паляўнічыя на аўтамабілі. (12+).
**20.00** Вулічныя гонкі. (16+).
**21.00** Смяротны ўлоў. (16+).
**2.00** Правілы пазадарожнага руху. (12+).
**4.40** Акулы аўтатаргоў з Даласа. (12+).
**7.10** Дылетант супраць эксперта. (12+).

## А вы ведалі?

# Як з'явілася гульня дартс

**Дартс (ад англ. darts — «дроцікі») — сукупнасць гульняў, у якіх гульцы кідаюць дроцікі даўжынёй не больш за 30,5 см і вагой не больш за 50 г у круглую мішэнь 45,1 см у дыяметры. Яна падзелена на 20 секцый, кожнай з якіх прысвоены лік ад 1 да 20.**



Лічыцца, што дартс прыдумалі англійскія лучнікі яшчэ ў эпоху Сярэднявечча. Абрэзаўшы звычайныя стрэлы, можна было практыкавацца ў трапнасці, кідаючы дроцікі ў бычыную шкуру, якая вісела на сцяне, або, па іншай версіі, у зрэз дрэва ці вечка ад піўной бочкі. Не трэба было нават выходзіць на двор, у дажджлівае і халоднае надвор'е можна было наладзіць невялікі турнір у пабе, прычым прыняць удзел у спаборніцтвах мог любы, незалежна ад узросту, фізічнай сілы. Паводле другой легенды, дартс быў прыдуманы адным з каралёў Англіі, жонка якога з-за хваробы не змагла прыняць удзел у паляванні. Жадаючы суцешыць каралеву, манарх прапанаваў ёй прабавіць час, кідаючы скарочаныя стрэлы ў шкуру быка, што вісела на сцяне.

Не дзіўна, што з часам дартс стаў папулярнай забавай у брытанскіх піўных, а для таго каб вызначыць пераможцу, трэба было ўстанавіць адзіныя правілы. У 1896 годзе нейкі цясляр з графства Ланкшыр Браян Гэмлін прапанаваў падзяліць мішэнь на 20 сектараў і налічваць ачкі ў залежнасці ад пападання ў іх. Вось толькі запатэнтаваць сваю распрацоўку Гэмлін не дадумаўся, таму вынаходнікам разметкі мішэні часта называюць больш прадпрымальнага Томаса Уільяма Баклі.

Цікава, што ў самым пачатку дваццатага стагоддзя папулярная гульня апынулася пад забаронай. У той час у Англіі існаваў закон, згодна з якім усе азартныя гульні ў піўных установах строга забараняліся. У лік забароненых забаў трапіў і дартс. Выратаваў яго адзін з уладальнікаў паба ў горадзе Лідс Джым Гэрсайд. Ён вырашыў даказаць мясцовым чыноўнікам, што дартс ніяк нельга аднесці да азартных гульняў, гэта, хутчэй, адзін з відаў спорту. Поспех у гэтай гульні залежыць не ад шанцавання, а ад майстэрства гульца. У якасці галоўнага аргумента Гэрсайд узяў з сабой мясцовага каваля Уільяма Энакіна, самага лепшага ў Лідсе гульца ў дартс. Каваль тройчы кінуў дроцікі ў сектар з нумарам 20. Чыноўнікі паспрабавалі зрабіць нешта падобнае, але, натуральна, нічога ў іх не атрымалася. Ім нічога не заставалася, як прызнаць, што дартс забараняць неразумна. Так, дзякуючы настойлівасці ўладальніка піўной, гульня была выратавана.

Праўда, доўгі час да дартса ставіліся менавіта як да забавы, але ўжо ніяк не лічылі яго відам спорту. Толькі ў 1927 годзе ў Лондане быў праведзены першы турнір, а Нацыянальная асацыяцыя дартса Вялікабрытаніі з'явілася толькі ў 1954 годзе. Забаўка наведвальнікаў піўных устаноў набыла статус спартыўных спаборніцтваў. Дарэчы, самыя лепшыя, класічныя мішэні вырабляюцца са спрэсаваных валокнаў расліны агава (сізалю) ■

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении торгов (конкурс) на право заключения договора аренды охотничьих угодий фонда запаса

Охотничьи угодья, расположенные на территории Лепельского района, Витебской области общей площадью 40480,29 га, в том числе лесные – 22625,90 га, полевые – 16302,82 га, водно-болотные – 1551,57 га. Участок имеет следующие границы.

**Южная граница:** от юго-восточного угла кВ. 137 Кащинского лесничества далее административной границы района, далее до южной границы кВ. 53, 52, 51 Волосовичского лесничества до д. Липки. Далее по южной границе кВ. 77, 76 Волосовичского лесничества по северной стороне кВ.20 до кВ. 19 Краснолукского лесничества. Далее по восточной стороне кВ. 19, и северо-восточной стороне кВ. 14, по восточной стороне кВ. 4 Краснолукского лесничества до кВ. 75 Волосовичского лесничества, далее по южной границе кВ. 80, 85, 84 Волосовичского лесничества до реки Байна. Далее по р. Байна до юго-западного угла кВ. 134 Слободского лесничества. Далее на юг через кВ. 5, 6, 24 Краснолукского лесничества до р. Эсса. Далее на запад по административной границе района через кВ. 44, 45, 39, 38, 43, 49, 42, 37, 31, 36 через кВ. 47, 46 по р. Юровка Слободского лесничества до юго-западного угла кВ. 46 Слободского лесничества.

**Восточная граница:** по западной стороне д. Даниловка на юг до кВ1 Волосовичского лесничества ГЛХУ «Лепельский лесхоз», далее по западной границе кВ 1 Волосовичского лесничества, далее по восточным границам выд.12, 32, 36, 41, 44, 46 кВ 2 Волосовичского лесничества, далее по восточным границам выд. 6, 28, 12, 17 кВ 9 Волосовичского лесничества, далее по западным границам выд. 7, 9 кВ.98 Волосовичского лесничества, далее по восточным границам выд. 4, 5, 3, 26, 27 кВ. 98 Волосовичского лесничества, далее по восточным границам выд. 5, 34, 25, 26, 27, 28 кВ. 10 Волосовичского лесничества до мелиоративного канала, далее по данному каналу до северо-восточного угла выд. 5 кВ. 91 Волосовичского лесничества, на восток до д. Деревня, далее по лесной дороге до д. Деревня до северо-западного угла кВ. 137 Кащинского лесничества, далее до северо-восточного угла кВ. 137 Кащинского лесничества, далее по восточной границе оз. Турицкое до юго-восточного угла кВ. 137 Кащинского лесничества.

**Северная граница:** от д.Черноручь, по автомобильной дороге на д. Большой Полсвиж, далее по дороге до д. Поддубъе, от д. Поддубъе по автодороге на д. Шубники до ее пересечения с ЛЭП 35 кВ, вдоль восточной стороны ЛЭП 35кВ на д. Залесье, далее от д. Залесье вдоль ЛЭП 35 кВ до пересечения с железной дорогой (Лепель–Орша), далее по железной дороге Лепель–Орша до д. Даниловка.

**Западная граница:** от юго-западного угла кВ. 46 Слободского лесничества на север по западной стороне кВ. 46, 40, 41, 35, 29, 22, 14, 12, 8, 4, 1 Слободского лесничества до северо-западного угла кВ. 1 Слободского лесничества. От северо-западного угла кВ. 1 Слободского лесничества по автодороге Минск–Витебск (М3) до поворота на д. Черноручье.

**Начальная цена конкурса**: 3 741, 96 (три тысячи семьсот сорок один рубль девяносто шесть копеек) рублей.

Порядок проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса определяется положением о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 20 января 2015 г. №26.

**Условия конкурса:**

1. создание не менее 10 рабочих мест;
2. обустройство в течение 1 года благоустроенных стоянок (не менее 4, с обязательным наличием на них: навес, стулья, костище, место для разделки туш, хранилище для дров, туалет) для охотников в пределах охотничьих угодий;
3. обеспечение наличия штата егерской службы в соответствии с действующим законодательством на протяжении всего срока аренды;
4. осуществление деятельности в соответствии с Правилами ведения охотничьего хозяйства и охоты, утвержденными Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 г. №580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими»;
5. использование охотничьих угодий по целевому назначению;
6. своевременная оплата аренды охотничьих угодий;
7. обеспечение в течение двух лет со дня получения специального разрешения (лицензии) на ведение охотничьего хозяйства, разработки проекта охотоустройства, представление его на государственную экологическую экспертизу в Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды и утверждение в Министерстве лесного хозяйства;
8. выполнение условий, указанных в биолого-экономическом обосновании или проекте охотоустройства;
9. установление в течение трех месяцев с даты заключения договора аренды охотничьих угодий информационных указателей (аншлагов) согласно охотоустроительной документации с указанием наименований пользователя охотничьих угодий, охотохозяйственных зон, других единиц внутрихозяйственного деления территории, информации о режиме охоты на данной территории, контактных телефонов пользователя охотничьих угодий, а также обеспечение надлежащего содержания указателей и читаемости размещенной на них информации;
10. принятие мер по приведению численности охотничьих животных к оптимальной и поддержание ее на этом уровне;
11. планирование и осуществление комплекса мероприятий, направленных на охрану охотничьих животных, увеличение, сохранение и улучшение популяции данных животных, их рациональное использование, обеспечение сохранности биоразнообразия;
12. обеспечение охраны охотничьих животных в арендуемых охотничьих угодьях численностью работников (егеря, охотоведы, инженеры по охотничьему хозяйству, руководитель и заместители руководителя пользователя охотничьих угодий), рассчитанной исходя из минимальных норм площади охотничьих угодий, осуществляющих охрану охотничьих животных в арендуемых охотничьих угодьях, согласно приложению 3 Правил ведения охотничьего хозяйства и охоты, утвержденных Указом Президента Республики Беларусь от 08.12.2005 г. №580;
13. ведение паспорта пользователя охотничьих угодий по форме, установленной Министерством лесного хозяйства, согласованной с Министерством природных ресурсов и охраны окружающей среды;
14. недопущение нарушения прав пользователей земельных участков, участков лесного фонда и водных объектов, в границах которых осуществляется ведение охотничьего хозяйства;
15. возмещение вреда, причиненного окружающей среде в процессе ведения охотничьего хозяйства, и ущерба, причиненного в результате уничтожения или повреждения сельскохозяйственных и лесных культур охотничьими животными;
16. организация регулирования распространения и численности охотничьих животных, в том числе пораженных заболеваниями, опасными для их жизни или здоровья других животных и (или) граждан;
17. выполнение предписания (постановления) органов охотничьего контроля, представление им запрашиваемой информации в сроки, установленные указанными органами (должностными лицами);
18. соблюдение Правил ведения охотничьего хозяйства и охоты, иных законодательных актов об охране и использовании животного мира, условий договора аренды охотничьих угодий и охотоустроительной документации;
19. обеспечение преимущественного права на охоту дееспособным гражданам Республики Беларусь, достигшим 18 лет, а также дееспособным иностранным гражданам и лицам без гражданства, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь и имеющим вид на жительство (далее – граждане), имеющим действительное государственное удостоверение на право охоты;

иностранным гражданам при наличии документа, удостоверяющего право этих лиц на охоту в государстве их обычного места жительства;

зарегистрированным по месту жительства в населенных пунктах, расположенных в границах охотничьих угодий;

20. соблюдение правового режима природных территорий, подлежащих специальной охране, и территорий, подвергшихся радиоактивному загрязнению в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС, при нахождении арендуемых охотничьих угодий в границах указанных территорий;
21. внесение задатка в размере 20 процентов суммы ежегодной арендной платы предоставляемых в аренду охотничьих угодий в сумме 748 рублей 39 копеек.

Уплата суммы задатка производится на счет райисполкома BY68 AKBB 3604 3190 0102 5210 0000, в ЦБУ № 211 ф-ла 214 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21214 УНП300039625, ОКПО 040626632000;

22. участник, выигравший конкурс, в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола комиссии возмещает Лепельскому райисполкому затраты на организацию и проведение торгов. Сумма затрат и порядок их возмещения доводится до сведения участников торгов до начала их проведения в день проведения торгов.

**Срок заключения договора:** 10 лет.

**Дата и место проведения конкурса:** 19 сентября 2017 г. в 15.00 в здании Лепельского райисполкома, кабинет №221.

**Для участия в конкурсе необходимы следующие документы:**

- заявление о предоставлении охотничьих угодий в аренду;
- биолого-экономическое обоснование на испрашиваемые в аренду охотничьи угодья, разработанные в соответствии с требованиями законодательства;
- предложения в письменной форме о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте;
- копии учредительных документов;
- копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка;
- доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов.

**Документы для участия в конкурсе принимаются до 15 сентября 2017 г. по адресу: г. Лепель, ул. Ленинская, 6, райисполком, каб. №226. Контактный телефон 80213241382, факс 80213241486**





## ЦЯЖКА БЫЦЬ ДЫПЛАМАТАМ...
### НАВАТ НАРОДНЫМ

Аднойчы пасля водпуску я трапіў у... водпуск, амаль на тыдзень. Як атрымалася? Раскажу.

Значыць, не паспеў я, адгуляўшы свае трыццаць дзён, уліцца ў калектыў ды з усімі павітацца, як выклікае мяне начальства ў асобе намесніка дырэктара. Так і так, пытае: ці добра адпачыў?.. І адказу майго не чакае — гне сваё: ну, калі нядрэнна, маўляў, то прымай даручэнне. Заўтра да нас прыязджаюць венгры з досыць цікавымі прапановамі наконт аўтаматычных ліній па атрыманні сокаў. Трэба прыняць як блізкіх сяброў: пасяліць у гасцініцу, вырашыць пытанне з харчаваннем, прадумаць культурную праграму, суправаджаць у час паездак...

Карацей, кажа Яфімавіч, кіраўніцтва табе давярае. Урэшце ўручае канверт з грашыма (так бы мовіць, матэрыяльнае забеспячэнне)...

Ну што тут будзеш рабіць? Адмаўляцца? Ды неяк не выпадае...

Значыць, распачаў я дзейнасць «згодна з намечаным планам»: жыллё, харчаванне, сустрэча гасцей...

Імі аказаліся два венгры і адна венгерка, узрост — плюс-мінус сорак, прычым адзін з мужчын (не такі страшны чорт, як яго малююць!) раней вучыўся і працаваў у Расіі...

Адпаведна — патрэба ў перакладчыку адпала адразу. Да таго ж госці былі на дзіва свойскімі, кампанейскімі, так што мы з імі досыць плённа працавалі і гэтак жа цікава жылі: чаргавалі дзелавыя візіты ды перагаворы з паходамі ў музеі і тэатры...

Тут трэба сказаць адну важную рэч: гэта з боку венграў быў, так бы мовіць, візіт у адказ, бо напярэдадні наша начальства на чале з гендырэктарам ездзіла ў Будапешт. Іх там вельмі цёпла прымалі... А што найбольш уразіла, дык гэта безліч рэстаранчыкаў ды кавярняў, якія яны стараліся не абмінаць.

«Нам таксама іх трэба ўразіць», — паставіў задачу дырэктар. У выніку на сераду мы адмянілі ўсе дзелавыя сустрэчы, пасадзілі гасцей у аўтобус і павезлі ў бок Налібоцкай пушчы — у сваю падшэфную гаспадарку. А паколькі яна знаходзілася на мяжы трох раёнаў Міншчыны, туды ж завіталі «дэлегаты» з суседніх гаспадарак. Я, можна сказаць, аслупянеў, убачыўшы безліч скрынак, торбаў і пакункаў, з якіх — апроч іншага — вытыркаліся рыльцы бутэлек...

Карацей, гаспадары «накрылі паляну», насмажылі шашлыкоў, наварылі юшкі. Тостаў прамовілі не менш, чым на Каўказе, прычым пілі — выключна гарэлку, мясцовую, на гаючых травах... Смаката, вам скажу!.. Госці і тыя прызналі, што гэта не горш, чым іхнія фірменныя «Па́лінка» ды «Унікум».

Я таксама «накаціў» бы, як сёння кажуць, але ж адчуваў персанальную адказнасць за гасцей, а таму (быў грэх, аб якім дагэтуль шкадую!) час ад часу выліваў гарэліцу пад стол на траву.

...На зваротным шляху госці што сілы галасілі «Мама, чаа» (іншых слоў ды іншых песень чамусьці не помнілі).

Нічога не скажаш: файна пасядзелі!

...Перад ад'ездам я наведаў іх новых сяброў у гасцініцы, падарыў на ўспамін традыцыйную «Белавежскую». Мы трохі пасядзелі, пагаманілі.

На гэтай хвалі і развітацца б, але мне раптам захацелася яшчэ большай цеплыні ў адносінах, і я на нешта сказаў гасцям пра свайго дзядулю, які ў 45-м, вызваляючы Венгрыю, загінуў каля возера Балатон.

Памянуўшы яго, мы змоўклі, і я ў хуткім часе пайшоў.

Па дарозе дамоў думаў: які цяжкі хлеб у нашых дыпламатаў! Колькі трэба ведаць і ўмець, як добранька думаць, перш чым сказаць... Бо мог жа ляпнуць яшчэ, што ў вайну ў нашай вёсцы мадзьяры стаялі — хаўруснікі акупантаў... І — хто ведае — можа, гэта былі дзяды маіх новых сяброў?

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

## ПОМСТА

...«Ты ведаеш, каго я сягоння падстрэліў?» — пытаецца паляўнічы ў знаёмага доктара. «Ведаю, касога, я толькі што яму перавязку зрабіў», — адказвае той. І тым самым... пазбаўляе чалавека цудоўнай магчымасці нешта збрахаць. Ды і сябе... Нештачка такое пачуць, бо рыбаловы ды паляўнічыя (вы ж ведаеце) жывы не будуць, каб не расказаць пра свае незвычайныя прыгоды, пра свае трафеі: то ў іх шчупакі на размах рукі, то зайцы не меншыя, чым па пудзе. І пры гэтым такія змыслыя...

Міхась, як мне расказвалі, прыроджаны паляўнічы. Хваліўся, што яшчэ дзед яго завальваў мядзведзя (не ўдакладняў, праўда, дзе той буры вадзіўся)... А бацька дык і наогул — жывога зайца злавіў! Як? Не паверыце: заціснуўшы... нагамі, калі той паміж імі хацеў прашмыгнуць.



Былі прыгоды і ў самога Міхася.

Неяк раз у складзе паляўнічай брыгады, апрануты ў белы маскіровачны халат, стаіць ён на нумары. Як тут раптам заяц — сабакі паднялі... І ляціць — проста на яго! Міхась ускідвае стрэльбу і...

Усё акурат як у Тараса-палясоўшчыка: «Зладжыўся стрэльбай — кляпсь! — не паліць, / Крамзель з другога! — не пякець!»

Міхась тады стрэльбу ўбок і — на кукішкі: рукі-ногі развёў і застыў — чакае...

Як казалі старыя егеры, нічога дзіўнага ў тым няма. У зайцоў лепш «працуе» бакавы зрок, а перад сабой заяц нікога не ўбачыць. Ляціць... Але ж... міма. Міхась кідэц на яго...

З паўхвіліны валтузня ў снезе ішла. Потым з яго вылятае спалоханы заяц, адбягае метраў на дзесяць, замірае на задніх лапках і глядзіць на Міхася. Той, бедны, зноў за стрэльбу. Хоча зарадзіць і не можа: не то рукі ад хвалявання трасуцца, не то патроны ад наліплага снегу ў ствол не лезуць.

Карацей, касавокі пачакаў быў працягу гульні і, убачыўшы, што марна, падаўся ў бок хмызняку.

— Мабыць, заяц няпросты быў, — прызналі сябры Міхася. — Мабыць, гэта... нашчадак таго самага зайца, якога твой бацька, Міхась, нагамі злавіў. Адпомсціў за продка.

...Пра гэтую помсту мне расказаў мой былы аднакурснік і, дарэчы, таксама падпісчык «Звязды». Ён у складзе той паляўнічай брыгады на суседнім нумары стаяў, бажыўся, што ўсё на ўласныя вочы бачыў. Значыць, так яно і было?

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

## СПРАВА ПРЫНЦЫПУ

...Адзін з вяскоўцаў згледзеў на вуліцы прыбраную суседку. Пытае: «Ну і куды ж ты гэтак спяшаешся?» — «У райцэнтр, — на хаду адказвае жанчына, — па сваёй патрэбе». — «А навошта гэтак далёка?»

Гэта — з назіранняў (праўда, у вольным пераказе) Янкі Брыля, а зараз — з нашых... і таксама чыстая праўда.

У 1931 годзе мінулага стагоддзя ў жыцці сельскіх жыхароў паўночнай часткі Петрыкаўскага раёна адбылася вялікая падзея: па новай чыгунцы, якая працягнулася ад Старушак да Бабруйска, пайшлі цягнікі. Першы з іх сустракалі і дарослыя, і дзеці, бо свята ж, бо не было тады ні добрых дарог, ні аўтамабіляў. А тут на табе: з Палесся, з гэтага глухога куточка, едзь куды хочаш! Для людзей столькі новых магчымасцяў, столькі новых працоўных месцаў! Ды і па абноўкі вяскоўцы ездзілі найчасцей у Бабруйск...

Дзед Апанас таксама туды наважыўся — радню праведаць, абутак купіць.

Сеў у цягнік, едзе, наваколлем любуецца, усё прыкмячае. А поезд жа не проста кіламетры адлічвае, ён яшчэ і спыняецца: адны пасажыры выходзяць, другія заходзяць.

Вось і дзед Апанас на невялікай станцыі Сякерычы выйшаў з вагона, пастаяў на драўляным пероне, пакруціў галавой — агледзеўся ды падаўся ў бок прыбіральні, што тулілася трохі воддаль, у лазняку. Толькі даклыпаў да яе, толькі дзверы зачыніў, чуе — дзяжурны па станцыі ў звон свой стукнуў, паравоз загудзеў, цягнік... крануўся.

— Сто-ой! — закрычаў яму ўслед Апанас, на хаду зашпіляючы порткі.

Але ж машыніст гэту каманду не пачуў: поезд паімчаў далей і, на жаль, без дзеда.

— Гэта ж трэба, — не пачакаў, — уголас крыўдаваў стары.

— А дзе ж вы гэтак забавіліся? — заспачувалі яму іншыя пасажыры.

— Ды ў маленькі домік схадзіў, была патрэба...

— А навошта, дзівак-чалавек? У цягніку ж таксама прыбіральня ёсць. Можна было туды...

— Туды, — строга перапыніў Панас, — хай іншыя ходзяць... А я, людцы, не: хоць забіце не пайду. Не тое ў мяне выхаванне...

На гэтым слове дзед закінуў за плячо сваю торбачку з гасцінцамі для бабруйскай радні і па шпалах пакрочыў дамоў — кіламетраў за дзесяць.

**Уладзімір Пугач,**
*м. Навасёлкі, Петрыкаўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

## Извещение о проведении 4 сентября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | |
|---|---|---|
| Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| «Автозаправка с площадкой» общей площадью 5221,5 кв. м, инв. номер 630/С-67164, расположенная по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143Н (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) с составными частями и принадлежностями | 39 800,00 | 3 900,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предметов торгов в соответствии с протоколом о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 4 сентября 2017 года в 16.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 21.08.2017 по 31.08.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(0176) 74-72-04 (ОАО «Электромодуль»)**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| Извещение о проведении повторного аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Узденское РАЙПО, Минская обл., г. Узда, пер. К. Маркса, 7 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Здание магазина** | Здание специализированное розничной торговли | 188,5 кв. м | 623/С-58402 | Минская обл., Узденский р-н, Хотлянский с/с, д. Любяча, ул. Центральная, 80 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Предоставлен Продавцу общ. пл. 0,1395 га, на праве постоянного пользования для обслуживания магазина |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **16 153,42 белорусских рублей (снижена на 20%)** |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 22.06.2017 г.**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **07.09.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **05.09.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

---

